# СВЕТЛЫЯ ДНІ

## ПРАВАСЛАЎНЫМ ХРЫСЦІЯНАМ БЕЛАРУСІ

*Дарагія суайчыннікі!*

*Сардэчна віншую вас з Вялікаднем.*

*Уваскрэсенне Хрыстова з'яўляецца для ўсяго хрысціянскага свету галоўным сімвалам сапраўднай ахвярнасці і ўсёдаравальнай любові. Вялікдзень пабуджае вернікаў задумацца над сэнсам чалавечага быцця, адчуць дачыненне да вечных каштоўнасцяў, заснаваных на дабрыні, міласэрнасці і спагадзе.*

*У гэтыя светлыя веснавыя дні кожны імкнецца акружыць клопатам родных і блізкіх, падзяліцца з імі радасцю свята, парыць цяпло душэўных зносін. Вялікдзень аб'ядноўвае людзей, натхняе на стваральную працу і новыя здзяйсненні на карысць сваёй Айчыны.*

*Няхай свята Уваскрэсення Хрыстова напаўняе нашы сэрцы верай і надзеяй, зацвярджае ў дамах і сем'ях мір і ўзаемаразуменне.*

*Ад усёй душы зычу вам моцнага здароўя, поспехаў, здзяйснення самых запаветных жаданняў, шчасця і працвітання.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

4 мая 2013 г. СУБОТА № 82 (27447) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# «ПРЭЗІДЭНТ-АТЭЛЬ» АДКРЫЎСЯ Ў МІНСКУ

**«Прэзідэнт-атэль» гатовы прыняць першых наведнікаў. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, перарэзаўшы сімвалічную стужку, адкрыў учора гасцініцу, перадае БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

Кіраўніка дзяржавы азнаёмілі з функцыянальнымі магчымасцямі «Прэзідэнт-атэля», арганізацыяй яго работы. Аляксандр Лукашэнка агледзеў некалькі нумароў гасцініцы, кангрэс-хол «Мінск», залу пасяджэнняў, басейн, рэстараны, іншыя памяшканні. Прэзідэнт падрабязна пацікавіўся якасцю работ па рэканструкцыі гасцініцы, тэрмінам акупнасці.

Адзінаццаціпавярховы будынак «Прэзідэнт-атэля» быў узведзены на месцы гасцінічнага корпуса «Кастрычніцкая». Работы былі пачаты ў студзені 2011 года, заказчыкам рэканструкцыі выступіла рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Атэль «Мінск», генеральнай падраднай арганізацыяй — турэцкая кампанія. Фінансаванне ажыццёўлена за кошт крэдытных сродкаў, прадастаўленых экспартным крэдытным банкам Турцыі «Цюрк Эксімбанк» (85 працэнтаў ад агульнай сумы затрат) і ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» (15 працэнтаў).

Як далажылі Прэзідэнту, цяпер гасцініца можа размясціць у два разы больш пастаяльцаў, чым ранейшая. Тут створаны ўсе ўмовы як для адпачынку, так і для правядзення розных афіцыйных, дзелавых мерапрыемстваў. «Прэзідэнт-атэль» дае магчымасць праводзіць у ім на высокім дзяржаўным узроўні мерапрыемствы па прыёме і абслугоўванні афіцыйных дэлегацый замежных краін, міжнародных арганізацый і дзелавых колаў, якія наведваюць Беларусь.

СТАР. 2

■ Заўтра — Дзень друку

## Уладзімір МАТУСЕВІЧ: «Інтэрнэт-прастора — новая пляцоўка для традыцыйных СМІ»

### Аднак развітвацца з друкаванымі версіямі яшчэ рана



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Апошнія некалькі гадоў колькасць айчынных зарэгістраваных друкаваных СМІ застаецца стабільнай — каля 1,5 тысячы найменняў. Акрамя таго, у нашай краіне распаўсюджваецца яшчэ і каля 4 тысяч замежных, пераважна расійскіх, выданняў. Разам з тым, агульнаразовы тыраж беларускіх СМІ — звыш 11 млн экзэмпляраў, замежных — менш за 2 млн. Трэба мець на ўвазе, што некаторыя спецыялізаваныя, тэматычныя замежныя выданні маюць у Беларусі невялікія тыражы, а, скажам, «Комсомольская правда в Беларуси» і «Аргументы и факты в Беларуси» — выданні айчынныя, зарэгістраваныя ў нашай краіне. Самай масавай газетай працяглы час застаецца «Советская Белоруссия».**

СТАР. 2



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ПАСХАЛЬНАЕ ПАСЛАННЕ ПАТРЫЯРШАГА ЭКЗАРХА ЎСЯЕ БЕЛАРУСІ

Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!

ХРЫСТОС УВАСКРЭС!

Сіла гэтага самага радаснага пасхальнага прывітання зноў азарае нашы сэрцы. Усяго два словы — але колькі ў іх сэнсу і глыбіні! Нікольки не перабольшваючы, мы можам сказаць, што ў іх выяўлена сутнасць усяго Евангельскага вучэння. Яны — кароткі сімвал нашай веры, што вынікае са слоў апостала Паўла, які гаворыць нам: «Калі Хрыстос не ўваскрэс, то марная і пропаведзь наша, марная і вера ваша, — а потым дадае: — Але Хрыстос уваскрэс з мёртвых, першынец з памерлых» (1 Кар. 15: 14, 20).

Вызнаючы Хрыста ўваскрэслым, мы выказваем сваю веру ў перамогу Дабра над злом, Жыцця над смерцю, Ісціны над падманам, Святла над цемрай... Вызнаючы Хрыста ўваскрэслым, мы напаўняемся надзеяй, што такая перамога магчыма ў жыцці кожнага з нас. Вызнаючы Хрыста ўваскрэслым, мы азараемся любоўю Самога Госпада нашага Ісуса Хрыста, Таго, Хто дараваў нам выратаванне ад граху, праклящця і смерці!

Уся наша вера, надзея і любоў — у словах «Хрыстос уваскрэс!» Яны скрозь стагоддзі яўляюць нам, па слове Апостала, прамудрасць Божую, у тайне скрытую, якую прадвызначыў Бог перад вякамі дзеля славы нашай (1 Кар. 2: 7).

Прызнаваць Хрыста ўваскрэслым з мёртвых — не ўмоўны звычай, не фармальнасць, не абстрактная ісціна. Мы верым, што Пасха Хрыстова мае непасрэднае дачыненне да нашага ўласнага жыцця і да жыцця вечнага.

Ва ўваскрасенні Хрыста, у Яго перамозе над смерцю для нас адкрываюцца новыя перспектывы. Калі мы, нараджаючыся, атрымалі ў спадчыну ад Адама смяротнасць чалавечай прыроды, то, адраджаючыся ў Хрысце праз Хрышчэнне і веру, мы набываем жыццё ўдосталь (гл. Ін. 10: 10). Паводле слова Свяшчэннага Пісання, як у Адаме ўсе паміраюць, так у Хрысце ўсе ажывуць (1 Кар. 15: 22).

Менавіта ў Таінстве Хрышчэння мы далучаемся да пладоў Крыжовай Ахвяры Госпада нашага Ісуса Хрыста. У Хрышчэнні мы становімся пахаванымі разам з Хрыстом, а затым уваскрасаем у Ім праз веру ў сілу Бога, Які ўваскрасіў Яго з мёртвых (гл. Кал. 2: 12).

Як гаварыў свяціцель Афанасій Вялікі, «Бог стаў чалавекам, каб чалавек стаў Богам». Адважымся пашырыць словы святога айца: Бог, стаўшы чалавекам, памёр, каб мы, абожыўшыся, уваскрэслі. Хрыстос за ўсіх памёр, каб тыя, хто жыве, жылі ўжо не для сябе, але дзеля Таго,



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Хто памёр за іх і ўваскрэс (2 Кар. 5: 15). І калі мы сапраўды ўваскрэслі з Хрыстом, то нам перш за ўсё трэба шукаць не зямнога і марнага, а высокага і вечнага, дзе Хрыстос сядзіць праваруч Бога (гл. Кал. 3: 1).

Вобраз Уваскрэслага Спасіцеля абавязкова адсылае нас да неабходнасці задумацца: ці выявіла сябе перамога Хрыста ў нашым асабістым жыцці? Ці ўваскрэс Хрыстос у нашай душы і ці паўсталі мы разам з Ім у сваім сэрцы?

Мы часта скардзімся на недасканаласць навакольнага свету. Але перамена гэтага свету да лепшага не можа адбыцца раней, чым мы самі паспрабуем зрабіць яго лепшым, пачаўшы з саміх сябе. І ў Хрысце мы маем рэальную магчымасць перамяніць сваё жыццё. Толькі ад нас залежыць, ці захочам мы ўстаць на барацьбу за сваю душу, за нашы сем'і, за наш народ — а ці дазволім нашаму жыццю паступова ператварацца ў пекла.

Гасподзь усё даў нам для таго, каб мы сталі спадкаемцамі Яго перамогі. Мужайцеся: Я перамог свет (Ін. 16: 33), — гаворыць Ён. Гэты заклік звернуты не толькі да апосталаў. Ён звернуты і да нас з вамі, жыхароў сучаснай Беларусі. Царква створана Богам для таго, каб усе мы маглі чэрпаць з Яе сілы на шляху да богазапаведанага міру. Нам дадзены Таінствы Споведзі і Прычасця, звяртаючыся да якіх мы задаём рытм духоўнага жыцця, рытм перамогі над грахом.

Міласць Божая творыць цуды ў нашай роднай Беларусі, уваскрашаючы душы людзей, вырываючы іх з путаў роспачы і граху, бязвер'я і нянавісці. Але галоўная радасць нашага жыцця — Царква Хрыстова. Я веру, што, пакуль беларусы будуць захоўваць у сваёй свядомасці паняцце пра святасць Царквы, Бог не пакіне нас.

Узлюбленыя ў Госпадзе дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы, прашу вас: веруйце ў Бога і захоўвайце вернасць роднай зямлі. У нас багатая і слаўная гісторыя — нам ёсць за што дзякаваць Богу! Сёлета народы Беларусі, Украіны і Расіі адзначаюць 1025-ю гадавіну Хрышчэння Русі.

Гісторыя святасці — гэта крыніца надзеі, апора для руху ў будучыню і ўмова нашага адзінства. Людзі адрозніваюцца па здольнасцях, сілах і інтарэсах. Але калі ў сэрцах нашых прысутнічае любоў да бліжняга і да Айчыны, то нашы адрозненні становяцца падобнымі да кветак на лузе. Яны выяўляюць прыгажосць агульнага, прыгажосць беларусаў як нацыі.

Я вітаю з Пасхай Хрыстовай нашых суайчыннікаў, якія знаходзяцца за межамі Радзімы. Ваша памяць пра Беларусь і яе Царкву, ваша праца і малітвы вельмі важныя для нас.

Дарагія мае! Будзьце пераймальнікамі Бога... і жывіце ў любові, як Хрыстос узлюбіў нас (Эф. 5: 2). Нясіце радасць пра Уваскрэслага Госпада ў навакольны свет: у сем'і, да суседзяў, сваякоў і калег. Не бойцеся цяжкасцяў жыцця веку гэтага, але перамагайце іх сілаю любові і малітвы, бесперапынна памятаючы пра тое, што ХРЫСТОС УВАСКРЭС! — Сапраўды ўваскрэс Хрыстос! Амінь!

**ФІЛАРЭТ**
**Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі,**
**Патрыяршы Экзарх**
**усяе Беларусі.**

*Пасха 2013 года, Мінск*

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел ПЕТРУЛЕВІЧ, начальнік упраўлення электрасувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі:**

***«Праект па зніжэнні ў Беларусі кошту міжсеткавых званкоў абмяркоўваецца сёння на ўзроўні спецыялістаў зацікаўленых дзяржорганаў. У бліжэйшы час плануецца выпрацаваць адзіны падыход па пытаннях зніжэння кошту інтэрканекту паміж сеткамі апаратараў сотавай электрасувязі і далейшым развіцці паслугі пераносу абаненцкага нумара (MNP). Званок паміж сеткамі сотавых апаратараў заўсёды даражэй, чым унутры сеткі, паколькі выкарыстоўваюцца рэсурсы трох апаратараў».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.05.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8680,00 | ▲ |
| Еўра | 11360,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 278,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1071,60 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 12° |
| Віцебск | + 12° |
| Гомель | + 26° |
| Гродна | + 12° |
| Магілёў | + 14° |
| Мінск | + 14° |

УВАГА: «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»!

## НАШ КУЛЬТУРНЫ СВЕТ

З чаго ён складаецца, як захоўваецца і ўзбагачаецца? На ўсе пытанні, якія тычацца існавання і развіцця культуры ў Рэспубліцы Беларусь, можна атрымаць адказ з вуснаў **міністра культуры Барыса Уладзіміравіча СВЯТЛОВА**. «Прамая лінія» пройдзе ў рэдакцыі газеты «Звязда» **23 мая**, час будзе ўдакладнены дадаткова.

Папярэдне пытанні прымаюцца па тэлефоне ў Мінску **287-18-69**, таксама іх можна дасылаць поштай ці на электронны адрас: **info@zviazda.minsk.by** (з паметкай «для аддзела культуры»). Адказы на найбольш цікавыя і актуальныя пытанні будуць надрукаваны ў газеце.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕЎРАКАМІСІЯ ЗАПАТРАБАВАЛА АД ЛІТВЫ ВЯРНУЦЬ ГРОШЫ, ВЫКАРЫСТАНЫЯ НЕ ПА ПРЫЗНАЧЭННІ

Еўракамісія запатрабавала ад Літвы вярнуць 3,449 млн еўра еўрапейскай дапамогі сельскай гаспадарцы, выкарыстанай не па прызначэнні. Недахопы пры размеркаванні сродкаў у рамках Праграмы развіцця вёскі выявіў еўрапейскі аўдыт. Акрамя Літвы, фінансавую дапамогу Еўракамісіі павінны будуць вярнуць яшчэ 13 краін — Бельгія, Чэхія, Германія, Ірландыя, Грэцыя, Іспанія, Венгрыя, Мальта, Польшча, Партугалія, Славенія, Славакія і Вялікабрытанія. Агульная сума выкарыстанай неналежным чынам дапамогі ў краінах ЕС складае 230 млн еўра.



### У КІРГІЗІІ РАЗБІЎСЯ АМЕРЫКАНСКІ САМАЛЁТ

У Кіргізіі разбіўся самалёт-палівазапраўшчык, які ляцеў з Бішкека ў Афганістан. На яго борце было некалькі дзясяткаў тон паліва. Катастрофа адбылася недалёка ад мяжы Кіргізіі з Казахстанам. Самалёт Boeing C-130 належаў Амерыканскаму цэнтру транзітных перавозак, перадае FOR.kg. Як сведчаць відавочцы, перад падзеннем самалёт разваліўся ў паветры на дзве часткі. На месцы яго падзення ўспыхнуў пажар. Пакуль названа папярэдняя прычына крушэння самалёта-запраўшчыка. Па інфармацыі МНС рэспублікі, ён разбіўся з-за тэхнічнай няспраўнасці.

### ШЧАЦІННЕ — ЗАЛОГ ПОСПЕХУ Ў ЖАНЧЫН?



Паводле апошняга даследавання Універсітэта Новага Паўднёвага Уэльса, жанчыны часцей аддаюць перавагу мужчынам з 10-дзённым шчаціннем, чым начыста выгаленым, піша Nature World News. Характэрна тое, што барада рабіла мужчыну прывабным у вачах і жанчын, і мужчын. У прыватнасці, яна асацыявалася з добрымі бацькоўскімі навыкамі. Трэба сказаць, яшчэ ў 2008 годзе брытанскія спецыялісты ўстанавілі, што для жанчын мужчына са шчаціннем уяўляўся ідэальным партнёрам для любых адносін: і кароткачасовых, і доўгачасовых. Пры гэтым барада рабіла мужчыну больш суровым, мужным і агрэсіўным.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ШТОГОД У ДТЗ ГІНУЦЬ 270 ТЫС. ПЕШАХОДАЎ

**Гэта 22% усіх ахвяр на дарогах. Да гэтых лічбаў прыцягнула ўвагу Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) напярэдадні Глабальнага тыдня бяспекі дарожнага руху, які праводзіцца 6-12 мая.**

Эксперты СААЗ адзначаюць, што сярод загінулых пешаходаў шмат дзяцей і пажылых людзей. Большасць няшчасных выпадкаў са смяротным зыходам прыпадае на краіны з нізкім і сярэднім узроўнямі даходаў, дзе расце колькасць аўтамабіляў. Аднак пытанне аб бяспецы пешаходаў па-ранейшаму актуальнае ў краінах усяго свету.

Штогод у дарожна-транспартных здарэннях ва ўсім свеце гінуць 1,24 млн чалавек. Мільёны атрымліваюць траўмы і становяцца інвалідамі. Чвэрць усіх ахвяр — гэта пешаходы, якія не маюць ніякага дачынення да транспартных сродкаў.

# ШКОЛЬНАЯ СТАРОНКА Ў ЛЕТАПІСЕ ГАЗЕТЫ

**«У маі 1942 года было вырашана выдаваць газету «Звязда», орган Мінскага падпольнага камітэта. Таварышы Нікіфараў, Сайчык і Валодзя абсталявалі новую тыпаграфію. Прычым першы нумар «Звязды» набралі ў друкарні імя Сталіна. Набралі газету Барыс Пупко і Воранаў Міхаіл. Першы расстраляны, другі з усёй сям'ёй у канцы верасня 1942 года арыштаваны гестапа. Набор «Звязды» вынеслі з тыпаграфіі і аддрукавалі на кватэры Трафімюка, пасля набор адбываўся на кватэры арыштаванага Грышына...». Гэта радкі са справаздачы аб працы Мінскага падпольнага камітэта ў другі год ваеннага ліхалецця. І сімвалічна, што адзін з музеяў, прысвечаных дзейнасці газеты-партызанкі, знаходзіцца сёння ў школе № 45, што месціцца якраз на вуліцы Нікіфарава. Туды і завіталі карэспандэнты «Звязды».**






Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Вось ужо мінула чвэрць стагоддзя ад таго часу, як да стэндаў музея падышлі першыя наведвальнікі. А экспанаты для выставы збіраліся ажно тры гады — ад таго моманту, калі школа пераехала ў новы будынак.

— Насамрэч школа павінна была мець нічым не адметны №172. Але калі я даведалася, што Вячаслаў Нікіфараў быў адным з рэдактараў газеты ў падполлі, то вырашыла дабіцца, каб нумар навучальнай установы набыў якуюсьці сімволіку. Так супала, што школы №45 у горадзе не было тады ўжо некалькі гадоў — у 1978 годзе яе будынак на вуліцы Суворава стаў аварыйным, — успамінае дырэктар школы Людміла Мацюшкова. — Увогуле я лічу, што выхаванне чалавека пачынаецца з гісторыі тых мясцін, дзе ён жыве, вучыцца, працуе... Таму і настаўнікі, і бацькі вучняў збіралі музейны фонд літаральна па крупінках.

СТАР. 2

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАРУЧЫЎ ЗВОЛЬНІЦЬ ВІНАВАТЫХ У ГІБЕЛІ ПАЦЫЕНТКІ Ў «ЭКАМЕДСЭРВІСЕ»

**У сувязі з трагічным выпадкам з пацыенткай медыцынскага цэнтра «Экамедсэрвіс» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў вызваліць ад займаемых пасад усіх вінаватых медработнікаў і адміністрацыйны персанал цэнтра, а таксама прымяніць да іх меры стрымання ў адпаведнасці з заканадаўствам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы даручыў таксама Міністэрству аховы здароўя ўзяць пад кантроль і кіраванне медыцынскі цэнтр «Экамедсэрвіс». Будучыня гэтай камерцыйнай арганізацыі будзе вызначана ў бліжэйшы час. Камітэту дзяржкантролю даручана праверыць фінансава-гаспадарчую дзейнасць цэнтра, а Следчаму камітэту забяспечыць прыняцце самых жорсткіх мер пакарання да вінаватых.

## «ПРЭЗІДЭНТ-АТЭЛЬ» АДКРЫЎСЯ Ў МІНСКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У гасцініцы ёсць кангрэс-хол на 600 месцаў, пяць канферэнц-залаў на 136 месцаў і дзве vip-залы на 105 месцаў, аснашчаныя мультымедыйнымі стэрэа- і канферэнц-сістэмамі, абсталяваннем для сінхроннага перакладу і правядзення відэаканферэнцый. У гасцініцы ёсць таксама тры рэстараны на 460 пасадачных месцаў, пяць бараў і чатыры банкетныя залы. Акрамя таго, у дадатковых карпусах размешчаны SPA і фітнес-цэнтры з плавальнымі басейнамі і саўнамі, начны клуб, падземны паркінг.

«Добрая, прыстойная гасцініца», — падагульніў Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць больш хуткага ўстаранення некаторых будаўнічых недапрацовак.

Кіраўнік дзяржавы таксама пакінуў запіс у Кнізе ганаровых гасцей. «У самым сэрцы Мінска вырас унікальны пяцізоркавы гасцінічны комплекс, які спалучае еўрапейскі камфорт з традыцыямі беларускай гасціннасці і ўтульнасці. Тут створаны ўсе ўмовы для зручнага пражывання гасцей нашай краіны, правядзення важных дзелавых сустрэч і перагавораў», — гаворыцца ў запісе. «Упэўнены, што калектыў вашай гасцініцы зробіць усё для таго, каб «Прэзідэнт-атэль» адпавядаў сваёй назве, стаў адной з адметных мясцін сталіцы, заваяваў міжнародны аўтарытэт і прызнанне. Няхай кожны, хто паселіцца ў новай гасцініцы, адчувае сябе ў гэтых цудоўных сценах, як дома, і з задавальненнем прыязджае сюды зноў і зноў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы».

## ДАКРАНУЦЦА ДА ГІСТОРЫІ

**У аддзеле «Мастацтва» Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага адкрылася выстава «Гродна ў XX стагоддзі». Падзея прымеркавана да юбілейнай даты — 885-годдзя старажытнага Гродна. Наведвальнікі бібліятэкі могуць пазнаёміцца з унікальнымі экспанатамі з прыватных калекцый сем'яў вядомых гродзенскіх калекцыянераў А. Рымарчука, Я. Паруліса, А. Сявенкі.**

Супрацоўнікі бібліятэкі размясцілі цікавыя кніжныя выданні з фонду аддзела «Мастацтва». А таксама звярнуліся да гродзенскіх калекцыянераў па дапамогу, і тыя адгукнуліся. На паліцах экспазіцыі можна ўбачыць старадаўнія і рэдкія кнігі, друкаваныя перыядычныя выданні, кнігі, фотаздымкі, паштоўкі, тэатральныя афішы, значкі і шмат іншых атрыбутаў былой эпохі.

XX стагоддзе — гэта некалькі эпох, таму і выстава дзеліцца па храналагічна-тэматычным парадку. Ёсць экспанаты і дакументы, звязаныя з падзеямі пачатку стагоддзя, калі горад уваходзіў у склад царскай Расіі, таксама кнігі і паштоўкі, прысвечаныя вядомым дзеячам, якія жылі ў Гродне. Сярод іх — сям'я паэта М.Багдановіча, польскія пісьменніцы Э. Ажэшка і З. Налкоўская, бацькі вядомага рускага пісьменніка Ю. Алешы...

Выстава знаёміць з дакументамі па гісторыі Гродзенскага гарнізона, кайзераўскай акупацыі горада-крэпасці, фотаздымкамі яе абаронцаў, газетай, датаванай жніўнем 1915 года. Міжваенны Гродна да 1939 года ў складзе другой Рэчы Паспалітай прадстаўлены матэрыяламі аб побыце насельніцтва горада, рэдкімі этыкеткамі і канвертамі са штампамі гродзенскіх прадпрыемстваў, матацыкламі мясцовай фабрыкі, газетамі, якія выдаваліся ў той час у Гродне. Асобная тэма закранае эміграцыю з нашага рэгіёна, а таксама абмен насельніцтвам пры перадачы Польшчы Беластоцкай вобласці.

Значная частка экспазіцыі закранае тэму Вялікай Айчыннай вайны (першыя баі ў чэрвені 1941 года, партызанская барацьба і вызваленне горада ў 1944 годзе). Захаваліся нумары франтавых газет, гістарычныя дакументы і ўзнагароды ваеннага часу. Дакументы захоўваюць памяць пра мінулае Гродна, нагадваючы ўсім нам аб трагічных старонках XX стагоддзя. Захаваем разам гісторыю для будучых пакаленняў, не парушыўшы прыгажосці архітэктурных ліній еўрапейскіх вуліц, ціхіх падворкаў, утульных завулкаў і драўляных брам.

**Ірына ШАТЫРОНАК.**

■ Парламенцкі дзённік

## ЗАХАВАЦЬ АДМЕТНАСЦЬ

**Падчас чарговага пасяджэння другой сесіі верхняй палаты беларускага парламента дэпутаты ўхвалілі законы, якія закліканы адначасова ўпісаць Беларусь у сусветныя тэндэнцыі і абараніць яе непаўторнасць.**

### Рамеснікам — добрыя заробкі

Гэта складаная задача — быць сучасным і, разам з тым, заставацца самабытным. Аднак яна неабходная для таго, каб не проста «рухацца з хуткасцю патоку», але мець шанц вырвацца наперад. Змяненні ў закон «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь» закліканы якраз захаваць умовы, пры якіх такая задача будзе вырашальнай.

— Закон Рэспублікі Беларусь аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) пачаў дзейнічаць у 1999 годзе, і карэкціроўка ў яго ўносілася толькі ў 2009-м, таму законапраект, у першую чаргу, накіраваны на ўдасканаленне норм дзеючага закона, — расказала журналістам **дырэктар Палаца культуры горада Маладзечна і дэпутат Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Святлана САРОКА.** — Унесеныя папраўкі першапачаткова былі адпрацаваны на месцах: з раёнаў і абласцей паступалі прапановы па карэкціроўцы заканадаўства. У законапраекце выпрацавана стратэгія захавання народных промыслаў і рамёстваў такім чынам, каб падтрымаць цікавасць арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія працуюць у гэтай сферы, і надалей яе развіваць.

Законапраект стварае ўмовы для адраджэння і развіцця традыцыйных народных промыслаў (рамёстваў), заахвочвання культурнай дзейнасцю фізічных і юрыдычных асоб, садзейнічанне развіццю гандлю вырабамі народных промыслаў (рамёстваў), правядзенню выстаў, кірмашоў, аўкцыёнаў.

У Беларусі працуе звыш 100 цэнтраў і дамоў рамёстваў, 2500 гурткоў і майстэрань па розных відах прыкладнога і выяўленчага мастацтва.

### Беларускім пародам — прызнанне

Законапраект «Аб племяннoй справе ў жывёлагадоўлі» таксама павінен абараніць беларускае, але ўжо ў цалкам іншай, досыць прыземленай сферы.

— Законапраект створыць умовы для далейшага развіцця племяннoй справы ў Беларусі і для ўліку ў племяннoй жывёлагадоўлі, што дазволіць прыняць закон аб ідэнтыфікацыі жывёл, — патлумачыў падчас брыфінгу **Мікалай РАДАМАН, старшыня СВК «Агракамбінат Сноў» і дэпутат Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.** — Беларускія пароды жывёл з'яўляюцца інтэлектуальнай уласнасцю Беларусі, якую неабходна абараніць. У свеце шмат агульных праграм па жывёлагадоўлі, і новы закон дазволіць нам удзельнічаць у іх. Што тычыцца індэнтыфікацыі, якая дазваляе прасачыць гісторыю жыцця жывёліны ад нараджэння да прылаўка ў краме, — то гэта патрабаванне часу, без якога наша мяса проста не купяць у Еўропе і астатнім свеце.

### Айчынным таварам — запатрабаванне

Сярод законапраектаў, якія 3 мая ўхваліў Савет Рэспублікі, былі таксама акты, якія тычацца электроннага дакументаабароту, састарэлага пастанаўлення Вярхоўнага Савета аб межах Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка і змен у закон аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці.

Акрамя таго, верхняя палата парламента дала згоду на прызначэнне Прэзідэнтам Беларусі членамі праўлення Нацыянальнага банка Андрэя Брышцелева, Дзмітрыя Калечыца, Дзмітрыя Лапко і Аляксандра Прышчыца. Пасля чаго кіраўнік Нацыянальнага банка Надзея Ермакова, якая прадстаўляла сенатарам новых членаў праўлення, адказала на пытанні журналістаў.

— Нацыянальны банк Беларусі сёлета за 4 месяцы купіў на ўнутраным рынку больш за $900 млн, — паведаміла яна. — Каля $250 млн прадала насельніцтва. Зараз насельніцтву больш цікава мець банкаўскія ўклады ў беларускіх рублях. Акрамя таго, у сакавіку валютная выручка прадпрыемстваў аказалася значна большай, чым у два папярэднія месяцы, дзякуючы павялічэнню аб'ёмаў продажу за мяжу мінеральных угнаенняў...

Продаж беларускіх тавараў на знешніх рынках на фоне фінансавага крызісу ў Еўропе і свеце адбываецца не проста, прызнала кіраўнік цэнтральнага банка краіны, ускладняе сітуацыю і ўступленне Расіі, з якой мы падзяляем адзіную эканамічную прастору, у Сусветную гандлёвую арганізацыю. Аднак усе гэтыя праблемы пераадольныя, калі якасць беларускіх тавараў будзе вышэйшая.

На пытанне журналістаў, чаму Нацыянальны банк не ўмацоўвае курс беларускага рубля, Надзея Ермакова адказала: «Нацыянальны банк не займаецца ўмацаваннем нацыянальнай валюты. Наша роля — згладжваць ваганні на фінансавым рынку краіны праз купля-продаж валюты і адсочваць, каб курс нацыянальнай валюты не надта апярэджваў інфляцыю. Мы нясём адказнасць за фінансавую стабільнасць у краіне, і апошняе Нацыянальнаму банку ўдаецца».

Пракаментавала кіраўнік Нацбанка і сітуацыю па інфляцыі і валавым унутраным прадукце ў Беларусі: «Паводле аператыўнай інфармацыі, інфляцыя за красавік будзе нават менш, чым мы разлічвалі. Базавая інфляцыя вытрымана па ўсіх разліках на 2013 год. Што датычыцца ВУП, то гэта паказчык таго, што могуць зрабіць нашы прадпрыемствы і кіраўнікі на вытворчасці. Вядома, Нацыянальны банк не задавальняе сённяшні тэмп росту валавога ўнутранага прадукту — мы павінны рухацца хутчэй, усе магчымасці для гэтага ёсць, — але застаюцца пытанні рэалізацыі прадукцыі, яе якасці. Тое, што ідзе на склад, таксама стрымлівае рост ВУП».

Старшыня праўлення цэнтральнага банка паведаміла таксама, што на наступным тыдні Нацбанк плануе разгледзець пытанне аб зніжэнні стаўкі рэфінансавання. У мінулы раз стаўка рэфінансавання ў Беларусі была зніжана ў красавіку на 1,5 працэнтных пункта да 27% гадавых.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА** ■

## «Інтэрнэт-прастора — новая пляцоўка для традыцыйных СМІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле слоў **намесніка міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзіміра МАТУСЕВІЧА,** новай пляцоўкай для СМІ, у тым ліку і друкаваных, стала інтэрнэт-прастора. У сучасных умовах друкаваныя СМІ павінны ўсё больш і больш клапаціцца аб сваёй прысутнасці ў сусветным павуцінні. Разам з тым, гаварыць пра развітанне з друкаванымі версіямі заўчасна. Папяровыя версіі па-ранейшаму запатрабаваныя сваімі чытачамі, аб чым сведчыць захаванне тыражоў. Журналістыка інтэрнэт-прасторы робіць пры гэтым стаўку на хуткасць падачы навін, інтэрактыўнасць, а журналістыка друкаваная — на якасць падачы інфармацыі, аналітыку і наяўнасць аўтарскага пункту гледжання.

— Для друкаванага слова заўсёды будуць важнымі аўтарскі почырк, развагі, глыбокае пранікненне ў тэму, — падкрэслівае Уладзімір Матусевіч. — Менавіта па гэтай прычыне, я лічу, чытач і цягнецца сёння да папяровага выдання. Аб гэтым сведчаць тыражы апошніх, хоць назіраецца і невялікае іх зніжэнне. Тым не менш, агульнаразовы тыраж толькі рэгіянальнай прэсы ў нас перавышае 900 тысяч экзэмпляраў. Я лічу, гэта нямала.

Супрацоўнік друкаванага выдання павінен быць сёння больш мабільным, здольным працаваць як на друкаваную, так і на электронную версію свайго выдання, умець падаваць інфармацыю, так бы мовіць, у двух варыянтах, з улікам спецыфікі ўспрымання прыхільнікаў таго ці іншага спосабу атрымання інфармацыі.

На сучасніка абрынуўся велізарны паток інфармацыі, і СМІ павінны вучыцца працаваць у гэтых новых умовах. Неабходна ўлічваць як «кліпавае» мысленне інтэрнэт-карыстальніка, так і патрэбы таго, хто падпісваецца на папяровую версію. Пры гэтым у любога патэнцыйнага чытача была і захоўваецца патрэба ў даверы да таго, што ён чытае. А значыць, інфармацыя павінна быць якаснай, а журналіст — адказным. Зразумела, выданні будуць імкнуцца ўтрымаць увагу аўдыторыі, крочыць за яе інтарэсамі, але гэта не азначае, што трэба зніжаць планку прафесіяналізму. Гэта азначае толькі неабходнасць пошуку новых цікавых фарматаў падачы. Здраджваць жа свайму майстэрству нельга ніколі. У гэтым сэнсе тое, што было каштоўным у журналістыцы ў мінулыя часы, застаецца каштоўным і цяпер. Глыбіня, разуменне праблемы, асабістая зацікаўленасць у раскрыцці тэмы і вырашэнні праблемы... Плюс — павага да аўдыторыі. Гэта ўсё вечныя каштоўнасці для журналістаў.

Хутчэй за ўсё, мы станем сведкамі змен у друкаваных СМІ. Так, сёння носьбітам друкаванага слова з'яўляецца папера, а ў недалёкай будучыні гэта можа быць іншы носьбіт. На нядаўняй выставе «СМІ ў Беларусі» дэманстраваліся планшэтныя версіі газет. Нашы выданні ўжо маюць пэўныя дасягненні ў распрацоўцы ўласных інфармацыйных парталаў. Такі праект прадэманстравала падчас выставы і газета «Звязда». Усё гэта будзе імкліва развівацца ў бліжэйшы час і патрабаваць высокага прафесійнага ўзроўню ў аўтарскай падачы інфармацыі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ШКОЛЬНАЯ СТАРОНКА Ў ЛЕТАПІСЕ ГАЗЕТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Адзін з найкаштоўнейшых экспанатаў музея — арыгінальны аўсвайс. У далёкім сорак першым акупанты выдалі яго бабулі настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Алы Макаўчык. З падробленымі пасведчаннямі такога ўзору семдзесят гадоў таму стваральнікі «Звязды» хадзілі па вуліцах Мінска.

На стэндах можна прасачыць усю гісторыю газеты ўключна да нашых дзён. Дапамогуць у гэтым сем прыгажунь-экскурсаводаў, якія вучацца ў шостых і адзінаццатых класах. Яны падрабязна раскажуць аб кожным экспанаце кожнаму госцю — як першакласніку, так і даросламу чалавеку. А ў самім музеі непасрэдна праводзяцца ўрокі па гісторыі Беларусі часоў ваеннага ліхалецця.

У вочы адразу кідаецца арыгінальны нумар «Звязды» за 1931 год, які быў набраны яшчэ тарашкевіцай. А на суседнім стэндзе — сапраўдны экзэмпляр ад 22 чэрвеня 1941-га. Апошні мірны нумар газеты ўжо сышоў са станка, калі фашысцкія лётчыкі пачалі скідваць на беларускую сталіцу дзясяткі бомб...

— Кожны можа зірнуць на літары шрыфтоў, якімі друкаваўся ўпотай у друкарні першы нумар і якія пазней пад страхам смерці выносілі наборшчыкі. Побач ляжаць адбіткі газет і пасляваенныя ўспаміны партызан, якія друкавалі «Звязду» са студзеня 1943 года на востраве Зыслаў у балотах Любаншчыны, — расказвае настаўніца гісторыі Ганна Манькоўская. — У нас ёсць і ксеракопіі трох падпольных нумароў газеты, якія былі выдадзены мінскімі падпольшчыкамі годам раней. Іх удалося зрабіць з дапамогай Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.




Даўно з карты сталіцы зніклі і дамы, дзе ў далёкім 1942-м убачылі свет пяць нумароў «Звязды», і нават вуліцы, на якіх яны стаялі, — Выдавецкая і 3-я лінія. Але памяць аб тых мясцінах захоўваецца ў школьным музеі. Бо семдзесят гадоў таму падпольшчыкі заплацілі жыццём, каб данесці да людзей праўдзівае слова...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Хочаце — верце...

## ЛЕГЕНДА ПРА «ЧОРНАГА РЭПАРЦЁРА»



**Любы журналіст, які працуе не першы год, пад настрой можа прыгадаць мноства гісторый (часам вясёлых, часам — зусім наадварот), звязаных з прафесіяй, героямі матэрыялаў, калегамі. Некаторыя з такіх аповедаў становяцца агульнавядомымі, а нейкія расказваюцца толькі на сваёй «працоўнай кухні». Напярэдадні нашага прафесійнага свята хацелася б расказаць адну легенду, пачутую... У рэшце рэшт, гэта не мае значэння, ад каго. Галоўнае, пра каго.**

...Гэтая гісторыя пачалася вельмі даўно. Настолькі, што нават старажылы «газетнага цэху» не могуць прыгадаць яе канкрэтную дату. Дакладна вядома толькі, што ўсё здарылася ў старым будынку Дома друку. Калі хто не ведае, калісьці ў ім на адным паверсе знаходзілася адразу некалькі рэдакцый. І вось у адну з іх у аддзел навін і рэпартажаў прыйшоў працаваць юнак, малады выпускнік. Трэба сказаць, што сваю прафесію ён вельмі любіў і літаральна прагнуў працы, гатовы быў і дняваць і начаваць у рэдакцыі. У думках яму бачыліся першапалосныя скандальныя інтэрв'ю, праблемныя рэпартажы, якія выклікалі шырокі грамадскі інтарэс і неадназначную рэакцыю калег — ад захаплення да зайздрасці. Вядома, аўтарам тых матэрыялаў быў ён, прызнаны і аўтарытэтны журналіст! Але гэта пакуль былі толькі мары... Тым не менш наш герой, уладкоўваючыся на працу ў рэдакцыю газеты, ніколькі не сумняваўся, што так будзе і наяве — дайце толькі час.

Што канкрэтна здарылася потым, чаму ўсё пайшло не так, як хацелася хлопцу, — версіі разыходзяцца. Ці тое рэдакцыі яшчэ больш ушчыльнілі, ці, можа, проста перавялі якую з паверха на паверх... Хто ведае, магчыма, адны людзі сышлі, а на іх месцы прыйшлі іншыя — новыя. Можа, аддзел кадраў які пралік дапусціў... Карацей кажучы, нейкім дзіўным чынам так атрымалася, што ў мітусні будзённых спраў у адной рэдакцыі вырашылі, што малады чалавек працуе ў калег-суседзяў, а там, у сваю чаргу, думалі гэтак жа пра іх... А трэба сказаць, што, нягледзячы на амбіцыйныя планы, сам наш герой быў даволі сціплым, нават, як ні дзіўна, сарамлівым. Працаваць ён вельмі хацеў! Але турбаваць лішні раз начальства і адцягваць на сябе ўвагу сабратаў па пяры не адважваўся. Хадзіў на працу і цэлыя дні праводзіў у чаканні задання. Не сумнявайцеся: ён бы яго выканаў найлепшым чынам!

Але ішоў час, дні праходзілі за днямі, а ніякіх заданняў не было. На хлопца папросту забыліся. З ім віталіся, пыталіся пра нейкія нязначныя рэчы, але ніхто ніводнага разу не прапанаваў галоўнага: зрабіць рэпартаж у нумар! Усе, напэўна, лічылі, што ён увесь час пры справе, працуе над чарговым матэрыялам. Як жа гэта было далёка ад ісціны!.. Ад усведамлення сваёй незапатрабаванасці, ад горычы, што ён не можа займацца тым, пра што марыць, ад сваіх унутраных перажыванняў малады чалавек літаральна счарнеў. Але і гэтага ў штодзённым кругавароце рэдакцыйнага жыцця ніхто не заўважыў... І аднойчы хлопец... знік. Як быццам растварыўся ў прасторы. Як многія потым здагадаліся, застаўся ў Доме друку назаўсёды. А пазней «пераехаў» у новы будынак, дзе больш за дваццаць апошніх гадоў размяшчаюцца рэдакцыі рэспубліканскіх газет. Як пра гэта стала вядома, хто першы заўважыў «Чорнага рэпарцёра» (так яго празвалі) — таксама блытаная гісторыя. Паказваецца ён не заўсёды і не кожнаму. «Чорны рэпарцёр» можа не нагадваць пра сябе доўгі час, а потым у нейкі адзін дзень мноства журналістаў па шэрагу прыкмет здагадваюцца, што ён недзе побач.

...Часам у кабінеце нечакана могуць бразнуць дзверы... Або са стала разлятаюцца паперы... А ў доўгім рэдакцыйным калідоры раптам пачынаюць варушыцца і прыўздымацца дываны... Большасць недасведчаных лічыць, што ў тым вінаватыя скразнякі. Гэта не так. Часам не так. Насамрэч гэта па паверхах Дома прэсы прагульваецца толькі па яму аднаму вядомым маршруце «Чорны рэпарцёр». Ён нікому не перашкаджае, проста (як можна здагадацца) ціхенька назірае за сваімі калегамі «па цэху», побач з якімі так і не атрымалася некалі спазнаць усе нюансы рэпарцёрскай працы. Што творыцца ў яго душы, ці шкадуе ён пра нешта?.. Гэта вядома толькі яму самому, «Чорнаму рэпарцёру». Але ён па-ранейшаму чакае задання!

...Калі вы пабачыце, як перад вамі ў калідоры на падлозе пачынае варушыцца дыван, па чарзе прыўздымаючыся і нібы перасоўваючыся вам насустрач, як быццам нехта нябачны шпацыруе па ім шырокімі крокамі — не разважайце доўга, скачыце ў цэнтр гэтага пухіра, гучна вымаўляйце: «Рэпарцёр, напішы ў нумар!» і загадвайце жаданне. «Чорны рэпарцёр», які так доўга чакаў гэтых слоў і так іх і не дачакаўся, абавязкова аддзячыць вам за тое, што звярнулі на яго ўвагу. Нехта просіць у яго павышэння па службе або вялікіх ганарараў, хтосьці — каб было паболей цікавых тэм, іншаму хацелася б атрымаць за сваю працу прэстыжную журналісцкую ўзнагароду... Праўда гэта ці не, вырашаць вам. Толькі калі прыйсці на працу вельмі рана ці затрымацца на ёй дапазна, часам у цішыні можна пачуць, як недзе нехта скокнуў і гучна звярнуўся да «Чорнага рэпарцёра». Па чутках, прыбіральшчыцы Дома прэсы часам засцігаюць за гэтым заняткам некаторых вядомых журналістаў...

Усіх са святам, калегі!

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## АНЁЛ У ТВАІМ СЭРЦЫ

**На Гродзеншчыне праходзіць ужо традыцыйная дабрачынная акцыя «Анёл у тваім сэрцы» па зборы сродкаў для дзяцей, якія маюць патрэбу ў дарагіх аперацыях за мяжой, пасляаперацыйным доглядзе, спецыяльным медыцынскім і рэабілітацыйным абсталяванні.**

Падчас дзвюх папярэдніх акцый было сабрана больш за 326 мільёнаў рублёў, што дазволіла палепшыць здароўе 22 дзецям. Напрыклад, маленькай Дашы Баярынавай была зроблена паспяховая аперацыя ў Германіі, якая дазволіла прыпыніць развіццё цяжкага захворвання. Удалося часткова зняць сутаргавыя мышачныя спазмы, даць магчымасць самастойна сядзець і перамяшчацца Вадзіму Суркову, Дар'і Чаканавай, Мікіту Бічэль і Ганне Гутар, якія хварэюць на дзіцячы цэрабральны параліч. Адзінаццаці дзецям дапамаглі з набыццём дарагіх медыцынскіх прэпаратаў. Гродзенскі цэнтр карэкцыйнага навучання і рэабілітацыі атрымаў для дзяцей-інвалідаў два рэабілітацыйныя пнеўмакасцюмы.

Гродзенскае абласное аддзяленне Беларускага дзіцячага фонду звяртаецца з просьбай прыняць удзел у акцыі «Анёл у тваім сэрцы». Яе вынікі будуць падведзены да Міжнароднага дня абароны дзяцей 1 чэрвеня.

Рэквізіты Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага дзіцячага фонду: г. Гродна, вул. Урублеўскага, 7, тэл. 43 00 99, разліковы рахунак № 3135575032010 у Дырэкцыі па Гродзенскай вобласці ААТ «Белінвестбанк», код 153001739, УНП 500176223, валютны рахунак № 3135575032023.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## «ЛІЧБА» ПЕРАХОДЗІЦЬ У «НАСТУП»

**Сёлета плануецца адключэнне аналагавага вяшчання на чатырох аб'ектах: у Асіповічах, Жодзіне, Бабруйску і Касцюковічах. На першым аб'екце адключэнне адбудзецца 1 жніўня.**

Пра гэта паведаміў журналістам падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры начальнік сектара тэлебачання і радыёвяшчання Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Віктар Зайцаў.

— Пасля гэтага ў людзей яшчэ будзе магчымасць некаторы час карыстацца аналагавым вяшчаннем, прымаючы сігнал з бліжэйшых радыётэлевізійных перадаючых станцый — Бабруйска і Калодзішчаў, — удакладніў ён.

Таксама было адзначана, што сёння працуе 65 перадаючых станцый, таму больш за 95% насельніцтва можа глядзець 8 тэлеканалаў у лічбавым фармаце

Што датычыць інтэрактыўнага тэлебачання, дык, па выніках мінулага года, ім карыстаюцца больш за 800 тысяч чалавек.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## ЗАВЯРШАЕЦЦА РАЗМЯШЧЭННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ ВАЛЮТНЫХ АБЛІГАЦЫЙ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

**Жыхары Беларусі працягваюць актыўна набываць валютныя аблігацыі Мінфіна 3-га выпуску, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.**

Ужо зараз з гэтага выпуску аблігацый, агульнага аб'ёму эмісіі ў 50 млн долараў, былі прададзены 94 працэнты дзяржаўных каштоўных папер. Цяпер у продажы засталіся аблігацыі на суму менш чым на 3 млн долараў, якія магчыма набыць толькі ў аддзяленнях Беларусбанка нашай сталіцы. Ва ўсіх астатніх рэгіёнах краіны такія дзяржаўныя каштоўныя паперы размешчаны ў поўным памеры.

Усяго з трэцяй дэкады 2012 года Мінфінам было прададзена насельніцтву дзяржаўных валютных аблігацый трох выпускаў на агульную суму больш як 97 млн долараў.

Нагадаю, што трэцім выпускам валютных аблігацый Мінфіна фізічным асобам прапануюцца каштоўныя паперы наміналам у тысячу долараў тэрмінам да 2 гадоў са стаўкай даходу 7 працэнтаў гадавых. Выплаты працэнтнага даходу ажыццяўляюцца раз у 6 месяцаў, а пагашэнне такіх аблігацый пачынаецца ў аддзяленнях Беларусбанка з 30 студзеня 2015 года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПЕРАДВЕЛІКОДНЫ КІРМАШ У ВІЦЕБСКУ

**Як паведамілі ў віцебскім гарвыканкаме, кірмаш адбудзецца 4 мая ў розных раёнах абласнога цэнтра.**

У прыватнасці, каля канцэртнай залы «Віцебск» будзе прадстаўлены вялікі асартымент нехарчовых і харчовых тавараў — у тым ліку велікодных кулічоў, яек, мяса птушкі. Рыбаводчыя гаспадаркі краіны прапануюць наведвальнікам кірмашу жывую рыбу (карп, таўсталобік, белы амур, карась), а таксама прадукцыю іх перапрацоўкі.

З улікам пачатку дачнага сезона будуць прадстаўлены ў продажы сельскагаспадарчая прадукцыя, садова-агародны інвентар, пасадачны матэрыял пладова-ягадных культур, мінеральныя ўгнаенні і іншае.

Адначасова кірмашы пройдуць на плошчы Пралетарскай, на вуліцы Цітова і ў новым «спальным» мікрараёне Білева.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ДАСТАЛІ З КАЛОДЗЕЖА ПЕНСІЯНЕРКУ

**Супрацоўнікі Баранавіцкага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях дасталі з калодзежа пенсіянерку, якая туды звалілася, паведаміла памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей Машноў.**

Як жыхарка Баранавічаў 1941 года нараджэння апынулася ў калодзежы з пітной вадой, глыбіня якога складае 12 м, ніхто не бачыў. Вядома толькі, што жанчына стаіць на ўліку ў псіхаанеўралагічным дыспансеры. Крыкі пацярпелай аб дапамозе пачула суседка па домаўладанні. Работнікі МНС пры дапамозе ратавальнай вяроўкі і пажарнага пояса выцягнулі пацярпелую з калодзежа. Пасля агляду медыкаў брыгады хуткай дапамогі жанчына з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне арганізма» была дастаўлена ў Баранавіцкую гарадскую бальніцу.

**БЕЛТА.**

## ЛЮСТЭРКА — ПРЫЧЫНА ПАЖАРУ

**У Віцебску ад звычайнага люстэрка адбыўся пажар у кватэры.**

Як паведамілі ў абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, невялікае люстэрка круглай формы стаяла каля акна, і сонечны прамень, які трапіў на яго, прапаліў плед, а потым агонь распаўсюдзіўся па кватэры.

Цікава, што некалькі гадоў таму ў Віцебску адбыўся аналагічны выпадак. У пажарнай службе заклікаюць не ставіць люстэркі так, каб на іх траплялі сонечныя прамяні і ў выніку не здарылася бяды.

## ІМКНУЛІСЯ Ў ЕЎРАСАЮЗ

**Каля вёскі Плюсы Браслаўскага раёна беларускія пагранічнікі затрымалі двух грамадзян Грузіі, якія незаконна спрабавалі перасячы мяжу з Еўрасаюзам.**

Яшчэ пяцёра іх суайчыннікаў былі затрыманы ноччу ў раёне населенага пункта Відзы. Іх суправаджала жыхарка Брэста. Кампанія на аўтамабілі «ВАЗ» рухалася ў бок беларуска-літоўскай мяжы. У дакументах жыхароў каўказскай краіны адсутнічалі штампы аб рэгістрацыі на тэрыторыі Беларусі. Затрыманыя не ўтойвалі, што планавалі незаконна перайсці мяжу для таго, каб знайсці лепшае жыццё ў Еўрапейскім саюзе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЭВАКУІРАВАЛІ 350 ПАРАСЯТ

**Гэтую працу работнікам МНС давялося выконваць у вёсцы Свенск Слаўгарадскага раёна, дзе здарыўся пажар у свінарніку.**

— У будынку, які быў падзелены цаглянай сценкай папалам, знаходзілася 1250 парасят. Работнікі прадпрыемства да прыезду выратавальнікаў ужо праводзілі эвакуацыю жывёл ва ўзросце да аднаго месяца, — паведаміла старшы інспектар цэнтра прапаганды МНС Наталля Скрабец. — Сумеснымі намаганнямі было эвакуіравана 350 парасят. Пацярпелых не было. Прычына пажару высвятляецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 17 (187)

■ Кінакрокі

# БЕЛЫЯ РОСЫ. ПЕРАЗАГРУЗКА

## Культавая беларуская савецкая камедыя атрымае нечаканы працяг?

**У Мінску на кінастудыі «Беларусьфільм» ваўсю ідуць здымкі фільма «Белыя росы-2». Менавіта такая рабочая назва ў фільма — працягу славутай беларускай савецкай камедыі 1983 года, знятай рэжысёрам Ігарам Дабралюбавым. Адным з аўтараў сцэнарыя новага фільма з'яўляецца Аляксей Дудараў, які працаваў з Дабралюбавым і на першым фільме.**

Цяпер беларусы, здаецца, уздумалі лічыцца з сусветнымі тэндэнцыямі і зрабіць сіквел — твор-працяг. Чым гэта прадыктавана? Хутчэй за ўсё — жаданнем зрабіць такі ж папулярны і паспяховы фільм, як і фільм-папярэднік. І ў сэнсе касавых збораў, і ў сэнсе народнай любові. Ці атрымаецца гэта ў маладога рэжысёра Аляксандры Бутар, выпускніцы Акадэміі мастацтваў (курс Аляксандра Яфрэмава), пабачым вясной 2014 года. Акурат на гэты час папярэдне запланавана прэм'ера стужкі.

Акалічнасці развіцця сюжэта пакуль што, вядома, ніхто не раскрывае. Але паведамляецца, што ў «Белых росах-2» галоўнымі героямі з'яўляюцца дзеці галоўных герояў мінулай «серыі». Пажыўшы ў горадзе, Андрэй Хадос едзе жыць на хутар. Аднак імклівая ўрбанізацыя засцігае яго і тут. Маладыя бізнесмены збіраюцца выкупіць участак Хадоса ды іншыя хутары, каб нешта на ім пабудаваць. Акурат так здараецца ў нашым рэальным жыцці. Толькі ў рэальнасці бізнесмены звычайна квапяцца не на непрыглядныя хутары, а на гісторыка-культурную каштоўнасць... Адным словам, Хадос не можа пацярпець такога гвалтоўнага ўмяшальніцтва і дапамагае сям'і ўзгадаць свае карані (вось тут увага!) і вырашыць усе «гарадскія» праблемы. Шматабяцальная анатацыя.

Так, ролю Галюні выконвае Ганна Палупанава, а двух зладзеяў-бізнесменаў — беларусы Сяргей Жбанкоў і Павел Харланчук. З беларускіх акцёраў задзейнічаны яшчэ Яўген Жуковіч, Юлія Смірнова і народны артыст Беларусі Віктар Манаеў.

Але як толькі ў беларускіх фільмах апошніх гадоў заходзіць гаворка пра акцёраў, то настрой ва ўсіх неадназначна псуецца. Справа ў тым, што ўсёткі самыя галоўныя ролі (Андрэй Хадос, Іван, Маруся) будуць выконваць запрошаныя акцёры: літовец Юозас Будрайціс і расіяне Андрэй Мярзлікін і Галіна Польскіх. Але фільм «Белыя росы-2» пазіцыянуецца як нацыянальнае кіно і нават атрымаў адпаведнае фінансаванне на Першым конкурсе кінапраектаў, які ладзіла Міністэрства культуры.

Тут, вядома, не ўсё ясна, але можна меркаваць: беларускі кінапракат вельмі маленькі для таго, каб фільм акупіўся толькі за кошт паказаў у Беларусі. А самы даступны для нас кіна- і тэлерынак — расійскі. А проста так туды не патрапіш: патрэбна, каб у цэнтры ўсяго былі папулярныя расійскія акцёры — «зоркі». Замкнёнае кола атрымліваецца. Толькі вось чаму нам ніяк не ўдаецца зрабіць такі фільм, які меў бы цалкам беларускі склад, але патрапіў хоць у адзін замежны кінапракат свету. Загадка стагоддзя. Можа быць, не варта замахвацца на амбіцыйныя высокабюджэтныя праекты, разлічаныя на масавага гледача, калі такая маленькая краіна, як Беларусь, мае цудоўны патэнцыял для развіцця камернага нацыянальнага псіхалагічнага кінематографа, які мог бы паспяхова прадстаўляць нас на прэстыжных міжнародных кінафестывалях, а не «рваць залы».


Фота БЕЛТА.

Да 21 мая здымкі фільма будуць працягвацца ў Мінску. Другі перыяд здымак запланаваны на жнівень-верасень 2013 года ў Гродзенскай вобласці.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ Асобы

# ПРАЎДЗІВЫЯ СКАРБЫ

**5 мая — дзень народзінаў слыннага беларускага і польскага кампазітара Станіслава Манюшкі. Добрая нагода ўспомніць таленавітага земляка. Не толькі ўспомніць, але і пазнаёміць нашых чытачоў з нетрывіяльным Манюшкам — звычайным чалавекам, з яго клопатамі і праблемамі, але пры гэтым геніяльным кампазітарам. А каб усё лепш запомнілася, давайце вернемся ў дзяцінства, калі таямніцы нам часцей за ўсё адкрывалі бацькі...**



— Сярод нашых продкаў, сынок, было шмат таленавітых людзей. Іх трэба ведаць, бо гэта наш гонар, — сказаў Бацька чатырнаццацігадоваму гарэзе, які атрымаў у школе нездавальняючую адзнаку за тое, што не ведаў, хто такі Станіслаў Манюшка.

*«Даехаў у Коўню з краявідамі даволі сумнымі; мястэчка, гэтак у кнігах услаўлёнае, на мяне аднак дыхнула прозай. Я ўсюды распытваў пра даліну Адама (Міцкевіча. — **Аўт.**); замест яе мне паказалі нейкі Дамулін, назвай даволі падобны; ніхто мяне не зразумеў. Цяжка быць апосталам у сваёй краіне! Таму пра Адама ніхто не ведае ў ягоным любым наваколлі. Прымаючы гэта ў разлік, я паскорыў мой выезд, падмануты ў сваіх летуценнях!»*

Сын сядзеў разгублены на самым ускрайку канапкі, што стаяла ў куце невялікага пакойчыка, зводдаль ад Бацькі, як заўсёды сядзяць дзеці, калі яны ў чымсьці вінаватыя, і схіліў галаву, марачы аб тым, каб хутчэй гэтыя маралізатарствы скончыліся.

*«О не! Ужо з гэтага моманту выпраўлюся: не буду наракаць, з пакорай аддаюся розным жыццёвым нечаканкам, буду прытрымлівацца майго прызначэння, спадзеючыся, што мой лёс і думкі мае да мэты...»*

— Добра, што хоць настаўнікі сталі пытацца аб такім і патрабаваць ведання, — працягваў Бацька з адценнем нейкай палёгкі ў голасе, быццам спраўдзілася даўняя ягоная надзея.

Раптам ён хуценька ўстаў і, кінуўшы Сыну «Пачакай», падбег да вялікіх, ад пола да столі, кніжных паліц у суседнім пакоі. Адшукаў, водзячы па тамах пальцам, патрэбны і ледзь не з дзіцячай радасцю вярнуўся да хлапчука.

*«Быў я на менскім балі-маскарадзе! Даволі таго паведаміць, каб ты магла зразумець, як за мае чатыры злотыя я быў частаваны. Людзей гэтым разам, не так як заўсёды, было няшмат — але і тых мне хапіла. Распуста, манернічанне, моладзь, дзяўчаты, удовы і замужнія жанчыны... Усе вартыя адно аднаго!»*

— Я разумею, што вызначэнне Манюшкі як «кампазітара і стваральніка нацыянальнай класічнай оперы» табе ні аб чым не гаворыць. У тым вялікі недахоп школы — усё занадта абагульнена, за словамі не бачны чалавек... — Бацька зірнуў на дзіцёнка: той яго не слухаў, цікаваў за гадзіннікам, відаць чакаючы, што вось-вось вернецца Маці з маленькай Сястрычкай і будзе ўжо не да яго. Мудры Бацька зрабіў выгляд, што гэтага не заўважыў. — Сядай бліжэй, сынок.

Хлопец быў вымушаны крануцца са зручнага «шкодніцкага» месца і перасунуцца ўшчыльную да Бацькі. Але тут зарыпеў замок у дзвярах — вярталася Маці з трохгадовай малюткай з прагулкі.

«Выратаваць гэты вечар ужо нішто не зможа, — стала ясна хлопцу. — А думаў, што яшчэ і на камп'ютары пагуляю...» Ён бачыў у татавых руках незразумелага, ці то бэжавага, ці то светла-карычневага колеру кнігу з маленькім малюнкам нейкай сядзібы і люстраным надпісам на беларускай ды польскай мовах «Станіслаў Манюшка. Ліставанне». І такі сум апаноўваў хлопчыка, ажно не выказаць. «Ну, нашто мне нейкі Манюшка? Жыў немаведама калі. Папісваў сумную, цягучую музыку, якая ўжо даўно састарэла, — зараз іншы час», — так разважаў тынейджар пад шархатанне кніжных лістоў: Бацька пераглядаў выданне і шукаў найбольш цікавыя месцы.

> **«...Чым болей гэтак званы лёс (які з'яўляецца не чым іншым, як толькі выпадкам чалавечай волі) нас мучыць, тым больш мы павінны пераконвацца, што адзіным суцяшэннем і адзіным шчасцем у гэтай даліне слёз з'ўляюцца не зямныя даброты, але раскоша душы, спакой сумлення, каханне, пачцівасць — яны праўдзівыя скарбы, якімі Неба нас абдарае, і толькі той шчаслівы, хто ўмее яго шанаваць, які разбіраецца ў тых дарунках Боскай шчодрасці, і дасягнуўшы іх, на тым супакойваецца».**

*«Толькі твае лісты вяртаюць мяне на хвіліну ў рэальны свет. — Заўтрашняй поштай адпраўлю табе некалькі рублёў на перакус для нашых птушанят. Прашу цябе, дай з іх хоць 10 рублёў на пражыццё матулі».*

— Ну, а мы вернемся да Манюшкі, — звярнуўся Бацька зноў да Сына.

— Напэўна, ты думаеш, што ў напісанні музыкі няма нічога гераічнага... — пачаў і раптам спыніўся Бацька, паглядзеўшы на летуценнага Сына, чые думкі былі дзесьці далёка.

*«Я самым рэгулярным чынам пішу да цябе з Менска кожнай поштай — першы ліст быў з байкамі, другі з грашыма (100 рублёў асігнацыямі), сёння ўжо трэці на чарзе. І ў кожным я малю Цябе, каб як найхутчэй ты выслала мне поштай партытуру і галасы «Латарэі». Акторы ўжо развучваюць — публіка ведае пра тое і чакае нецярпліва. Вызвалі мяне з клопату! — Цяпер музыка для мяне ўся мая зброя! Толькі яна прамаўляе за мяне».*

*«Толькі ў нашых сямейных клопатах мы бачым і штодня пераконваемся, што Бог ёсць на небе, на зямлі і на кожным месцы. Зрэшты, дзе толькі ад чалавечай літасці, дапамогі і судоў залежыць, усюды людзі людзьмі. Але ж кажуць: старэйшы пан Бог, чым пан Рымша, таму не трэба губляць надзеі і цешыцца тым, чым добры Бог нас абдаруе. Чым болей гэтак званы лёс (які з'яўляецца не чым іншым, як толькі выпадкам чалавечай волі) нас мучыць, тым больш мы павінны пераконвацца, што адзіным суцяшэннем і адзіным шчасцем у гэтай даліне слёз з'ўляюцца не зямныя даброты, але раскоша душы, спакой сумлення, каханне, пачцівасць — яны праўдзівыя скарбы, якімі Неба нас абдарае, і толькі той шчаслівы, хто ўмее яго шанаваць, які разбіраецца ў тых дарунках Боскай шчодрасці, і дасягнуўшы іх, на тым супакойваецца».*

Каб прыцягнуць увагу, Бацька сунуў у хлапечыя рукі раскрытую кнігу. Сын, які, як той казаў, шукаў сувязі з космасам, прахапіўся і ўбачыў надрукаваны ў кнізе партрэт. Стомлены і спакойны мужчына глядзеў з малюнка. Сумныя вочы з падкрэслена апухлымі вейкамі. Вялікі падбародак і смешныя, як падалося хлопцу, бакі. Сцятыя вусны. Незвычайна шырокі лоб і гладкія кароткія валасы. А Бацька між тым працягваў:

— Сапраўды, ён не падобны на супермена. Аднак яму давялося прайсці, можа, праз большыя пакуты, чым каму б то ні было з герояў, — Бацька на імгненне спыніўся. — Але што казаць, калі лепей ты сам адчуеш...

І клапатлівы Бацька пачаў зачытваць розныя кавалкі ліставання слыннага кампазітара з нарачонай (пасля жонкай), маці, сябрамі.

*«Памятай і старайся пра грошы, каб я атрымаў іх своечасова — у нядзелю ўвечары... Ад Мамы толькі, ні маёй, ні тваёй не бяры грошай».*

*«Палю Антосевы цыгары, але кожную цыгару ўспрымаю як выжабраную, дык яна мне не ў смак і на карысць не ідзе. Нягледзячы на гэта, усё маё суцяшэнне ў здароўі, якое мне верна служыць, і гэта наводзіць мяне на роздум, што калі б не было да чаго імкнуцца, дык Бог і сілы ад мяне адабраў бы».*

*«Адна сама немагчымасць разлічыцца з панам Клюкоўскім гэтак абцяжарвала сэрца, што я не мог адважыцца адказаць на ягоныя патройныя звароты. Даручаныя мне ноты я пусціў на распродаж, і на сваіх камесійных зарабіў як Клюкоўскі на мне, гэта значыць, ані нотаў, ані грошай, ані справаздачы, што з імі дзеецца. Хай ліха возьме ўсе грашовыя інтарэсы паміж сябрамі — прашу Цябе надалей, хоць бы з голаду паміраў у Варшаве, не памагай мне і не слухай голасу пачцівага сэрца».*

— Татка, пачакай, пачакай, — перапыніў чытанне Сын. — Ён жа ўвесь час толькі аб недахопе грошай і іншых праблемах піша. А пра музыку зусім зрэдку, — хлопча шчыра не разумеў, як гэта славуты кампазітар жыў так кепска і быў вымушаны абы-як існаваць, напаўгалодным, у далечыні ад родных і любых, ад сваёй любімай, калі не сказаць каханай, Вільні.

— А музыку ён пісаў паміж гэтымі праблемамі, не зважаючы на іх. Ён жыў не абы жыць, а дзеля мэты. Ён жыў, як і ўсе, яму было няпроста, але ж зрабіў за жыццё шмат, — адказваў Бацька з радасцю на твары ад таго, што атрымалася зацікавіць падлетка. — Спадзяюся, што і ты, сынок, навучышся гэткай адданасці свайму пакліканню.

❐ ❐ ❐

Уначы Сын прысніў, як Станіслаў Манюшка займаўся судовай справай адносна спадчыны нейкіх родзічаў, каб не застацца зусім без нічога, але прайграў яе. Сніў і тое, як кампазітару хацелася разам з Юзэфам Сікорскім наладзіць выхад перыядычнага выдання на тэрыторыі Беларусі, але ізноў нічога так і не атрымалася. Але ж чуў у сне таксама прыгожую музыку — адзіны скарб Манюшкі, што быў з ім пры жыцці ды застаўся і пасля смерці.

Раніцай хлопец выйшаў да стала снедаць вельмі сур'ёзны.

— Ведаеш, тата, калі б я быў тады побач з Манюшкам, калі ён жыў, то я абавязкова б яму дапамагаў. Я хацеў бы быць ягоным сябрам, — раптам паведаміў падлетак.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Формула ўдачы

# «ТУФЛІКІ» ІДУЦЬ

## Фільм пра Халакост «Туфлікі» з беларускім удзелам атрымаў Гран-пры VIII італьянскага кінафестывалю «Imperia»

**Кароткаметражны мастацкі фільм «Туфлікі» (рэжысёр — Канстанцін Фам), у стварэнні якога брали ўдзел кінематаграфісты Беларусі (Беларускі відэацэнтр), Расіі, ЗША, Чэхіі, Францыі і Польшчы, назбіраў ужо цэлую калекцыю ўзнагарод. Днямі стала вядома, што карціна «Туфлікі» (пра якую «Звязда» неаднойчы пісала, як пра станоўчы і плённы прыклад сумеснай вытворчасці ў кінагаліне) атрымала Гран-пры «Сярэбраная стужка» буйнога італьянскага кінафестывалю «Imperia».**

«Туфлікі» распавядаюць пра гісторыю пары чырвоных жаночых чаравічкаў, лёс якіх пачаўся ў вітрыне крамы і трагічна абарваўся ў брацкай магіле абутку канцлагера «Асвенцым»... На працягу ўсёй стужкі вы не ўбачыце аніводнага чалавека ў кадры. Галоўныя героі гэтага фільма — ногі і абутак. Менавіта праз гісторыю абутку рэжысёр паказвае ўвесь жах трагедыі Халакосту. Беларускія гледачы пазнаёміліся з фільмам у рамках мінулагодняга кінафестывалю «Лістапад».

Арыгінальнасць мовы, высакароднасць і гуманістычнасць пасылу фільма ацаніла і журы італьянскага кінафестывалю, які ўваходзіць у спіс 13 найважнейшых кінафестываляў незалежнага кіно свету па версіі ЮНЕСКА. Сёлета на фэст было пададзена 721 заяўка з 52 краін. З Беларусі было прадстаўлена 5 кінастужак. У тым ліку дакументальны кароткаметражны фільм Віктара Аслюка «Цяпло» (вытворчасць — Белвідэацэнтр) быў адабраны ў асноўны конкурс фестывалю.

Спадзяёмся, на гэтым перамогі беларускага кіно ў свеце не спыняцца. Тым больш, што акурат у сярэдзіне месяца стартуе 66-ы Канскі кінафестываль, на якім таксама будуць прысутнічаць прадстаўнікі з Беларусі.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ Выстава

# АЎТОГРАФ — ДЛЯ ГІСТОРЫІ

## Кожны можа апынуцца ў кампаніі Джона Траволты

**Прынамсі, ваш аўтограф можа красавацца побач з яго роспісам — на адной выставе. Такім чынам, пакінуць свой след у гісторыі можна... у «Доме-музеі І з'езда РСДРП». Сімвалічна. Але не настолькі лёсавызначальна, хутчэй, гэта прыкольна...**

Насамрэч філіял Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі прадстаўляе інтэрактыўную выставу, на якой можна пабачыць арыгінальныя аўтографы знакамітых асоб з усяго свету: палітыка Тоні Блэра, футбаліста Алівера Кана, біятланісткі Магдалены Нойнер, акцёра Джона Траволты і іншых. Інтэрактыўнасць у тым, што побач з іх аўтографамі вы можаце пакінуць свой — на спецыяльным стэндзе. Адзін подпіс — і вы сярод знакамітасцяў! А калі гэтага мала для адчування ўласнай важкасці, то прафесійны графолаг тут жа можа даць сваю кансультацыю пра тое, што вы ўяўляеце сабой як асоба, якія якасці вам уласцівыя.

Але гэта толькі частка выставы. Таму што насамрэч яна пазнавальная: гісторыя аўтографаў звязана з гісторыяй пісьменства. Таму можна даведацца, што было, калі людзі карысталіся берасцянымі граматамі яшчэ да з'яўлення ў нас паперы, што сабой уяўлялі чарніліцы і пёры для пісьма, як выглядаюць рукапісы вершаў, якімі былі першыя газеты, што такое самвыдат. Асабліва цікавая частка, якая тычыцца беларускіх пісьменнікаў і гісторыкаў, дзе прадстаўлены пячаткі асабістых бібліятэк, экслібрысы, а таксама кнігі з дарчымі надпісамі, зробленымі рукой вядомых у Беларусі людзей. Напрыклад, ліст Якуба Коласа Янку Маўру 1943 года. Ён прадстаўляецца шырокай публіцы ўпершыню.

Нездарма аўтографы выклікаюць трапятанне ў душы: калі аўтограф знакамітасці здабыты асабіста, то ён дае адчуванне далучанасці да жыцця таго, каго паважаеш. Любыя запісы, зробленыя класікамі (ці то аркушы з радкамі, ці то іх подпісы і дарчыя надпісы), — гэта яшчэ і частка гісторыі той краіны, дзеля якой яны працавалі і стваралі. Таму сам прыход на такую выставу — гэта ўжо след у гісторыі, якую ты ствараеш сёння, нават тады, калі яе імкнешся спасцігнуць.

Ну і як жа на выставе пра аўтограф без аўтограф-сесіі? Пісьменнікі і музыканты, якія абавязкова завітаюць на такую выставу, гатовы да кантактаў з тымі, каго цікавіць сучасная беларуская культура. А яна, безумоўна, пакіне свой след у гісторыі дзякуючы як творцам, так і тым, дзеля каго яны працуюць.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Ведай нашых!

### КУПАЛАЎСКІ «ОФІС» ЕДЗЕ НА ЧЭХАЎСКІ ФЕСТЫВАЛЬ

**Адзін з самых прэстыжных тэатральных фестываляў на постсавецкай прасторы абраў да ўдзелу спектакль беларускага тэатра «Офіс». Пастаноўка Кацярыны Аверкавай паводле п'есы нямецкага драматурга Інгрыд Лаўзунд — адна з самых яркіх, якія з'явіліся ў афішы тэатра імя Янкі Купалы за апошнія гады.**

П'еса хоць і замежная, але такая зразумелая, бо сёння офісная праца паглынае ўсё большую колькасць беларусаў. Як гэта «паглынае»? Ды вось спектакль якраз і ілюструе гэты працэс. Як чалавек — жывы і харошы —- можа стаць безаблічным і бесхрыбетным, калі жыве дзеля ўяўнай кар'еры, павышэння заробку і выслужвання перад начальствам. І тое, што было ў ім добрага і чалавечага (тое, што ўсё ж застаецца, але вельмі глыбока), згасае перад лямпачкай, якая кліча ў кабінет шэфа... Сучасныя праблемы сучасных людзей знайшлі сучаснае ўвасабленне. За што спектакль атрымаў перамогу на Міжнародным моладзевым тэатральным фестывалі ў Кішынёве. І пасля гэтага наспела запрашэнне ў Маскву, дзе спектакль пакажуць 24 мая на сцэне тэатра імя Пушкіна. Але «Офіс» беларускага ўзору патрапіў у рэгіянальную праграму фестывалю імя Чэхава і будзе паказаны ў Рызе. У рэпертуары Купалаўскага тэатра ёсць яшчэ шыкоўнае «Вяселле», выдатная інтэрпрэтацыя Чэхава маскоўскім рэжысёрам Уладзімірам Панковым на беларускай глебе. І хоць ты едзь у тую Маскву, каб паглядзець гэты спектакль: у нас у афішы яго даўно не было. А вось «Офіс», дарэчы, перад маскоўскім паказам можна паглядзець у Мінску 4 мая на сцэне канцэртнай залы «Мінск».

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Прэм'ера

# ПУЧЫНА ПУЧЫНІ

## У Оперным прагучала арыя, якая скарыла стадыёны

**У вядомым тэатры оперы і балета Беларусі новая пастаноўка. Здаецца, трэба радавацца: і так аднастайны рэпертуар нашага тэатра павялічыўся на адно новае найменне. Але — зноў Джакома Пучыні. Рэжысёр Міхаіл Панджавідзэ паставіў оперу кампазітара «Турандот». І наўрад ці можна сказаць, што гэта істотна разнастайвае рэпертуар Опернага: з 29 пастановак, якія ёсць сёння ў рэпертуары тэатра, 4 складаюць оперы Джузэпэ Вердзі і 4 — Джакома Пучыні. Акрамя гэтага, у рэпертуары багата іншых італьянскіх прозвішчаў: Расіні, Даніцэцці... Опера, як вядома, адзін з самых застылых і кансерватыўных відаў мастацтва. Але ж і яна жывая. А дзе мы ў гэтым рэпертуары бачым оперу ў развіцці? Дзе сучасныя пастаноўкі ? Але гэта пытанні на злобу дня. Што ж тычыцца самой «Турандот»...**

Але вельмі парадавала тое, што беларуская пастаноўка заканчваецца акурат там, дзе скончыў пісаць музыку сам Пучыні. Кампазітар чатыры гады працаваў над операй, але памёр у 1924 годзе ад страшнай хваробы, не паспеўшы скончыць свой твор. У выніку яго вучань Франка Альфана дапісаў заканчэнне оперы па чарнавіках майстра, якое, па сведчаннях тых, хто бачыў оперу ў дапісаным варыянце, выглядае вельмі пафасным. У беларускім тэатры гучыць, так бы мовіць, аўтэнтыка.



Пафасная, па-багатаму зробленая пастаноўка Міхаіла Панджавідзэ пра часы старажытнага Кітая і злосную прынцэсу-феміністку Турандот — спявачка Ніна Шарубіна (калі асэнсоўваць гэтага персанажа з сучаснага пункту гледжання) — шыратой размаху, памерамі і бліскучасцю дэкарацый простага гледача, які прагне эфектнага відовішча, уражвае. Нават інтэрпрэтацыйна ёсць над чым паразважаць: каханне прынца Калафа (Сяргей Франкоўскі) перамагае злосць і фемінізм бязлітаснай прынцэсы Турандот і вызваляе не толькі яе саму ад унутраных комплексаў і мужчыinduced наненавісніцтва, але і яе народ — ад яе ж дыктатуры. Любоў ёсць свабода. Выдатны тэзіс. А вядомая арыя Калафа Nessun Dorma («Ніхто не спіць»), якая стала самым папулярным класічным творам пасля таго, як брытанскае тэлебачанне скарыстала яе ў якасці галоўнай тэмы на Чэмпіянаце свету па футболе ў 1990 годзе, гучыць як праслаўлены на ўвесь свет крык адчаю. А паводле класічных законаў драматургіі, адчай часта папярэднічае катарсісу. Змешаныя пачуцці катарсісу і роспачы адчуваеш, калі рабыня Калафа Лу (Анастасія Масквіна), якая даўно і безадказна кахае прынца, сканчвае жыццё самагубствам, каб выратаваць Калафа і яго бацьку (Станіслаў Трыфанаў)... Гераіня Масквіной сваёй самаахвярнасцю і непатрабавальнасцю да сябе выклікае выключна прыязнасць і спачуванне. І веру ў нецынічнасць і бескарыслівасць, нягледзячы ні на што.

Ёсць рэч, якой варта чакаць, калі ідзеш на пастаноўкі Міхаіла Панджавідзэ, — камп'ютарныя праекцыі. Гэтыя маштабныя абсалютна неапраўданыя баталіі пікселяў на ўсю авансцэну Опернага тэатра выклікаюць прыступы лёгкага непаразумення. Здаецца, што гэтае пустое відэа і абсалютна выпадковая графіка (якія ёсць і ў «Сівой легендзе», і ў «Набука», напрыклад) патрэбны толькі для таго, каб дасягнуць апагею вонкавай бутафорыі. Маўляў, паглядзіце, якую дарагую і багатую пастаноўку здзейсніў наш тэатр. Ну і што? Для чаго, уласна кажучы, у «Турандот» патрэбны гэтыя зробленыя ў 3D галінкі дрэў, выявы кітайскіх ідалаў і нейкая выпадковая архітэктура, як не для банальнага запаўнення прасторы? Вось тут такое месца, тут спявае хор, расслабцеся, паслухайце, паглядзіце не на сцэну, дзе з 6 раду балкона відаць толькі дробныя чалавечыя фігуркі, а на гэтыя маштабныя пікселі на гіганцкім экране. Тут углядацца не трэба. Хіба што толькі трошку падумаць: што да чаго? Трэба прызнацца, у «Турандот» плюс у тым, што праекцыі гэтыя скарыстаны збольшага дазіравана, без перабору. Калі б яшчэ стваральнікі адказвалі за якасць...

У беларускай пастаноўцы оперы «Турандот» старажытны Пекін узноўлены не пры дапамозе камп'ютарнай графікі (якая якраз і павінна дазваляць эканоміць на пышных нятанных дэкарацыях), тут увесь Пекін — на сцэне. Дамкі, лаўкі, лесвіцы з тысячамі прыступак, якія дэманструюць усю глыбіню сцэны Опернага. Да таго ж пастаноўка вельмі «густанаселеная» і «багата апранутая», за выключэннем натоўпу простых людзей — народу. І не апошнюю ролю тут адыгрывае якраз гэты народ, ён жа — хор. Ён чуйна рэагуе на ўсе так званыя грамадскія працэсы, якія адбываюцца ў Пекіне тых даўніх часоў, спрабуючы па меры магчымасцяў паўплываць на іх. А яго бездапаможнасць і адначасова ўплывовасць падкрэсліваецца дзякуючы цудоўнай гульні ценяў і святла (гучыць шматсэнсоўна), якія выклікаюць стылістычныя асацыяцыі з культурай Усходу наогул.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

17.05.2013 г. в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. О выплате дивидендов по результатам 1 квартала 2013 г.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Время регистрации в день проведения собрания с 14.30 до 15.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 08.05.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 400022625 Наблюдательный совет.

16 мая 2013 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.
Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 08.05.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200050191 Совет директоров.

17.05.2013 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж».

Повестка дня:

1) О приобретении акций ОАО «Сантехэлектромонтаж» на баланс Общества.
2) Об участии в других обществах.
3) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Сантехэлектромонтаж»: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а.
Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 08.05.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 400052115 Наблюдательный совет.

■ Ёсць праблема

# АЗДАРАЎЛЕНЧАЯ КАМПАНІЯ СТАРТУЕ БЕЗ ПЕДАГОГАЎ-ПРАФЕСІЯНАЛАЎ?

**Падчас летняй аздараўленчай кампаніі, якая стартуе праз месяц, могуць узнікнуць сур'ёзныя цяжкасці з камплектаваннем аздараўленчых летнікаў прафесійнымі педагогамі.**

— Адмена дзеяння пастановы Міністэрства працы № 71 ад 5 мая 2000 года «Аб аплаце працы медыцынскіх і педагагічных работнікаў арганізацый, што фінансуюцца з бюджэту, якія выязджаюць для работы з навучэнцамі і выхаванцамі ў месцы аздараўлення» рэзка знізіла ступень сацыяльнай абароны педагогаў і фактычна выключыла эканамічныя фактары іх матывацыі да работы ў аздараўленчых арганізацыях, — патлумачыў журналісту «Звязды» **намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА.**

У прыватнасці, адмененая пастанова змяшчала некалькі важных для педагогаў пазіцый. Па-першае, калі педагог ехаў працаваць у летнік з кругласутачным знаходжаннем ці санаторна-курортныя ўстановы ў перыяд, які не супадаў з яго працоўным водпускам па асноўным месцы працы, то за ім захоўвалася сярэднямесячная заработная плата па асноўным месцы работы. Пры гэтым аплата працы педагогаў пры накіраванні з групамі дзяцей і падлеткаў у аздараўленчыя і санаторна-курортныя ўстановы або прыцягненне іх для работы ў загарадных аздараўленчых летніках ажыццяўлялася па стаўках (акладах), прадугледжаных па займаемых у месцах аздараўлення пасадах.

Па-другое, у выпадку прыцягнення педагагічных работнікаў для работы ў аздараўленчых летніках з дзённым знаходжаннем у перыяд, які не супадаў з іх працоўным водпускам па асноўным месцы работы, аплата працы павінна была ажыццяўляцца звыш устаноўленай па тарыфікацыі вучэбнай нагрузкі па стаўках (акладах), прадугледжаных па займаемай пасадзе ў летніку, за фактычна адпрацаваны час з захаваннем заработнай платы ў межах вучэбнай нагрузкі, устаноўленай да пачатку канікул. І хоць з аплатай працы педагогаў у дзённых школьных летніках у апошнія гады ўзнікалі пэўныя пытанні, у прыватнасці, у кошт пуцёвак у аздараўленчыя лагеры не ўключаліся выплаты па фондзе заработнай платы для педагагічных работнікаў, закладзены ў дакуменце алгарытм арыентаваў на шляхі вырашэння праблемы. Цяпер увогуле незразумела, якім чынам будзе аплачвацца работа педагогаў падчас аздараўленчай кампаніі. Пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ад 6 сакавіка 2013 года №23 быў адменены дакумент, які рэгуляваў гэтае пытанне апошнія 12 гадоў.

— У большасці педагогаў працоўны водпуск прыпадае на ліпень і жнівень. Аднак першая аздараўленчая змена распачынаецца ўжо праз месяц. Атрымліваецца, што педагогу прапануюць узяць у чэрвені водпуск за свой кошт, каб атрымаць за сваю работу ў аздараўленчым лагеры значна менш, чым ён бы атрымаў за работу ў школе? Прабачце, але малаверагодна, што гэта спрацуе. У ліпені і жніўні, магчыма, хтосьці з педагогаў і пажадае дадаткова падзарабіць падчас працоўнага водпуску, а вось з камплектаваннем высокапрафесійнымі педагагічнымі кадрамі першай аздараўленчай змены абавязкова будуць праблемы. Хутчэй за ўсё, замест прафесійных педагогаў у летніках будуць працаваць студэнты педагагічных ВНУ. Праўда, іх таксама не хопіць для задавальнення патрэбы ў кадрах. Але ж ці можа абысціся выхаваўчы працэс без удзелу прафесіяналаў? — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Раман Дапіра.

У сувязі з гэтым Цэнтральны камітэт Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі звярнуўся і ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, і ў Міністэрства адукацыі з просьбай растлумачыць дзеянні наймальнікаў у вырашэнні згаданых пытанняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

***(Працяг тэмы — у адным з бліжэйшых нумароў «Звязды».)***

# БЕЛАРУСКІ ДЭСАНТ У ШВЕЦЫІ

**Сёння афіцыйная дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні Белтэлерадыёкампаніі Маратам Маркавым вылятае ў Мальмё, дзе завяршаюцца апошнія прыгатаванні да міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013».**

Ужо ў аўторак, 7 мая, у прадстаўніцы Беларусі Алены Ланской адбудзецца першая індывідуальная рэпетыцыя, на якой будзе выстаўляцца гук і ўсе элементы нумара. Другая рэпетыцыя, касцюміраваная, пройдзе 10 мая. А яшчэ праз чатыры дні Алена Ланская з песняй «Solayoh» выступіць у першым паўфінале «Еўрабачання». Нагадаем, паводле выбару прадзюсараў шоу, ёй дастаўся 11 нумар. Кампанію беларускай выканаўцы на сцэне складзе інтэрнацыянальная каманда: бэк-вакалісты з Сербіі і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, танцоры з Германіі і Славеніі. А за кулісамі, акрамя прадзюсараў, перажываць за вынік выступлення будзе педагог па вакале Алекс Панаі (раней ён двойчы прадстаўляў родны Кіпр у якасці канкурсанта, а летась працаваў з беларускімі ўдзельнікамі «Еўрабачання», гуртом «Litesound»).

Дарэчы, учора стала вядома, што каментаваць музычна-тэлевізійнае шоу сёлета будзе вядучы Агенцтва тэленавін Яўген Перлін. А балы ад Беларусі ў фінале конкурсу абвесціць знакамітая біятланістка Дар'я Домрачава. Дарэчы, на ролю «вяшчальнікаў» прэтэндавалі таксама алімпійская прызёрка па плаванні Аляксандра Герасіменя і лідар беларускай зборнай па мастацкай гімнастыцы Меліта Станюта, але 18 мая, у дзень фіналу «Еўрабачання», іх не будзе ў Беларусі.

Нагадаем, «Еўрабачанне-2013» пройдзе ў шведскім горадзе Мальмё з 14 па 18 мая. У сёлетнім конкурсе пад дэвізам «We Are One» («Мы адзіныя») выступаюць прадстаўнікі 39 краін свету. Беларусь бярэ ў ім удзел ужо ў дзясяты раз.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 400/С-76345 (назначение – здание специализированное животноводства, наименование – здание свинарника), площадью 404,3 кв.м, 1984 года постройки, составные части и принадлежности: колодец (ж/б кольца 8 шт.), забор (длина 65 м, высота 1,8 м), ворота (металлические 2 шт.) |
| **Местонахождение объекта** | Гродненская область, Гродненский р-н, г.п. Сопоцкин, ул. Яна Павла 2, 70 А |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 422056200001000432 площадью 0,2036 га<br>(назначение – земельный участок для обслуживания здания свинарника)<br>по адресу: Гродненская область, Гродненский р-н, г.п. Сопоцкин, ул. Яна Павла 2, 70 А<br>(право аренды сроком до 11.06.2111 г.) |
| **Начальная цена продажи** | 98 127 360 (девяноста восемь миллионов сто двадцать семь тысяч триста шестьдесят) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 4 906 368 (четыре миллиона девятьсот шесть тысяч триста шестьдесят восемь) белорусских рубля |
| **Продавец** | ОАО «Молочный Мир», 230005, г. Гродно, ул. Горького, 93,<br>тел./факс 43-01-72, факс 8-017-210-83-51 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,<br>г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней<br>с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк»<br>по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 7 июня 2013 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 6 июня 2013 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Капитальное строение инв. № 420/С-42206 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – подсобное помещение) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: забор (литер а); ворота (литер б), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Радюка, 1.<br>- Капитальное строение инв. № 420/С-42213 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: склад (литер А1/к); подвал (литер (А1/к)); склад (литер Б1/к); подвал (литер (Б1/к)); склад (литер В1/к), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Радюка, 1, корп. 1.<br>- Капитальное строение инв. № 420/С-42214 (назначение – здание специализированное транспорта, наименование – гараж) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: гараж (литер А1/к); гараж (литер Б1/к); дворовое покрытие (литер В); уборная (литер 1); забор (литер Б); ворота (литер А), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Радюка, 1, корп. 2.<br>- Капитальное строение инв. № 420/С-42215 (назначение – здание специализированное общественного питания, наименование – буфет № 4) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: пристройка (литер Б1/к); Здание киоска 1, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Радюка, 1, корп. 3. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 441330000007000333<br>общей площадью 0,1442 га, по адресу: г. Лида, ул. Радюка,1 |
| **Начальная цена продажи** | 1 120 000 000 (один миллиард сто двадцать миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 112 000 000 (сто двенадцать миллионов) белорусских рублей |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Капитальное строение инв. № 420/С-5930 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин №16) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: ворота (литер А); дворовое покрытие (литер б), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Комсомольская, 26 В. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 441300000007000277<br>общей площадью 0,0326 га<br>по адресу: г. Лида, ул. Комсомольская, 26 В |
| **Начальная цена продажи** | 1 100 000 000 (один миллиард сто миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 110 000 000 (сто десять миллионов) белорусских рублей |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Капитальное строение инв. № 420/С-39301 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 14/30) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: подвал (литер (А 2/к)); терраса (литер 1); терраса (литер 2); забор (литер А); забор (литер Б); ворота (литер В); дворовое покрытие (литер Г); водопроводная сеть (литер Е); наружная сеть электроснабжения (литер Ж), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Железнодорожная, 12.<br>- Капитальное строение инв. № 420/С-42217 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения хранилищ, наименование – здание склада), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Железнодорожная, 12/1. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 441300000011000455<br>общей площадью 0,02426 га,<br>по адресу: г. Лида, ул. Железнодорожная, 12 |
| **Начальная цена продажи** | 6 300 000 000 (шесть миллиардов триста миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 630 000 000 (шестьсот тридцать миллионов) белорусских рублей |
| **ЛОТ 4** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Капитальное строение инв. № 420/С-33082 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 43) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: склад (литер В1/к); гараж (литер Г1/к); склад (литер Д1/к); столярный цех (литер Е1/к); склад (литер Ж1/к); сварочный цех (литер З1/к); бытовые помещения (литер И1/к); склад (литер К1/к); склад (литер Л1/к); склад (литер М1/к); уборная (литер 1), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Коммунистическая,– 38А.<br>- Капитальное строение инв. № 420/С-33277 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 51) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: холодная пристройка (литер 1); эстакада для разгрузки хлеба (литер а); ворота (литер б); дворовое покрытие 480м.кв. (литер в); забор (литер Г); дворовое покрытие (Литер д); тепловая сеть (Литер е), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Коммунистическая, 38.<br>- Капитальное строение инв. № 420/С-5931 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: склад (литер А1/д); склад (литер Б1/к); склад (литер В1/к), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 4.<br>- Капитальное строение инв. № 420/С-46997 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин №52) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: пристройка (литер Б1/к); пристройка (литер В1/к); холодная пристройка (тамбур), (литер 1), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 2. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 441300000010000096<br>общей площадью 0,3387 га<br>по адресу: г. Лида, ул. Коммунистическая, 38 |
| **Начальная цена продажи** | 4 200 000 000 (четыре миллиардов двести миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 420 000 000 (четыреста двадцать миллионов) белорусских рублей |
| **ЛОТ 5** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Изолированное помещение инв. № 420/D-105686 (назначение – торговое помещение, наименование – помещение магазина №50), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Труханова, 21-24. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 441300000007000278,<br>общей площадью 0,1458 га<br>по адресу: г. Лида, ул. Труханова, 21-24 |
| **Начальная цена продажи** | 2 200 000 000 (два миллиардов двести миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 220 000 000 (двести двадцать миллионов) белорусских рублей |

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 6** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Капитальное строение инв. № 422/С-3652 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин №59) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: склад (литер Б1/к), расположенное по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, аг. Скрибовцы, магазин №59.<br>- Капитальное строение инв. № 422/С-3653 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), расположенное по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, аг. Скрибовцы. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 425883913601000019<br>общей площадью 0,0600 га<br>по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, аг. Скрибовцы, магазин №59 |
| **Начальная цена продажи** | 140 000 000 (сто сорок миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 14 000 000 (четырнадцать миллионов) белорусских рублей |
| **ЛОТ 7** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Капитальное строение инв. № 420/С-27097 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин №60) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: пристройка (литер Б1/к); склад (литер 2); склад (литер 3); склад (литер 4); уборная (литер 5); забор (литер А); забор (литер Б), расположенное по адресу: Лидский р-н, Гончарский с/с, д. Селец, ул. Молодежная, 11А. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 423682707164000024<br>общей площадью 0,1052 га<br>по адресу: Лидский р-н, Гончарский с/с, д. Селец,<br>ул. Молодежная, 11А |
| **Начальная цена продажи** | 120 000 000 (сто двадцать миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 12 000 000 (двенадцать миллионов) белорусских рублей |
| **ЛОТ 8** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Капитальное строение инв. № 420/С-28576 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 64) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: подвал (литер (А 1/к)); навес (литер 1); забор (литер а); ворота (литер б); дворовое покрытие (литер в); здание киоска 2; биотуалет, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Машерова, 23 А. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 441300000011000435<br>общей площадью 0,1391 га<br>по адресу: г. Лида, ул. Машерова, 23 А |
| **Начальная цена продажи** | 4 400 000 000 (четыре миллиарда четыреста миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 440 000 000 (четыреста сорок миллионов) белорусских рублей |
| **ЛОТ 9** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Капитальное строение инв. № 420/С-30076 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 74) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: пристройка (литер Б1/к); холодная пристройка (литер 1); навес (литер 2); павильон (литер 3); эстакада для разгрузки хлеба (Литер А); ворота (Литер Б); ограждение (литер В); забор (Литер Г); дворовое покрытие (литер Д), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Труханова, 10. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 441300000007000268<br>общей площадью 0,0863 га<br>по адресу: г. Лида, ул. Труханова, 10 |
| **Начальная цена продажи** | 1 200 000 000 (один миллиард двести миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 120 000 000 (сто двадцать миллионов) белорусских рублей |
| **ЛОТ 10** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Изолированное помещение инв. № 420/D/107560 (назначение – торговое помещение, наименование – магазин № 82), расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 27, пом. 59. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 441300000007000069<br>общей площадью 0,4806 га<br>по адресу: г. Лида, пр-т Победы, д. 27 |
| **Начальная цена продажи** | 2 500 000 000 (два миллиарда пятьсот миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 250 000 000 (двести пятьдесят миллионов) белорусских рублей |
| **Примечание** | Объект недвижимости находится в аренде сроком действия до 01.09.2015 г. |
| **ЛОТ 11** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - Капитальное строение инв. № 420/С-5927 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы) с дворовыми сооружениями, включенными в техпаспорт: пристройка (литер Б1/к); холодная пристройка (литер 1); забор (литер А); дворовое покрытие площадь (литер Б), расположенное по адресу: г. Лида, ул. Железнодорожная, 16. |
| **Земельный участок** | Кадастровый номер 441300000011000456<br>общей площадью 0,0992 га<br>по адресу: г. Лида, ул. Железнодорожная, 16 |
| **Начальная цена продажи** | 900 000 000 (девятьсот миллионов)<br>белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 90 000 000 (девяноста миллионов) белорусских рублей |
| **Продавец** | Открытое акционерное общество «ДОРОРС»,<br>220007, г. Минск, ул. Вокзальная, 17а,<br>тел.: 8-017-225-20-04, факс 8-017-225-60-64, 225-21-62 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,<br>г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней<br>с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк»<br>по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 5 июня 2013 г. в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом резидентом Республики Беларусь:* заверенная копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица и заверенные копии учредительных документов;
- *индивидуальным предпринимателем:* документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, до продажи объекта в процессе аукционных торгов, без объяснения причины.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений 4 июня 2013 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
Дополнительная информация: www.ino.by**

Усё пра Еву

■ Твае ролі

# Я паспею ўсё!

## або Вучыцеся балансаваць паміж работай і сям'ёй

**Марыса Маер, дырэктар кампаніі Yahoo, заступіла на сваю пасаду летам 2012 года — на 6-м месяцы цяжарнасці, заявіўшы, што будзе працаваць на працягу свайго водпуску па доглядзе дзіцяці. Праз два месяцы пасля пачатку яе працы інтэрнэт-парталы паведамілі, што Марыса занялася «пераацэнкай стратэгічнага развіцця кампаніі, уключаючы планы па скарачэнні штату і размеркаванні капіталу сярод акцыянераў».**

**Нямногія жанчыны, аказаўшыся ў такім становішчы, выбралі б новую пасаду і кар'ерны рост: складана, а часам, здаецца, і немагчыма паспяхова сумяшчаць сям'ю і працу, выконваць абавязкі і жыць пры гэтым паўнавартасным жыццём. Рэсурсны цэнтр ЮНФПА прапануе 5 парад тым, хто хоча быць паспяховай матуляй і не кідаць пры гэтым працу.**

### 1. Падрыхтуйцеся да правільнага старту

Па меркаванні **Вольгі ЯНЧУК, старшыні Асацыяцыі маладых хрысціянскіх жанчын, кандыдата сацыяльных навук,** калі ўжо наша жанчына стварае сям'ю, то з усіх сіл спрабуе стаць добрай гаспадыняй. Праз некалькі месяцаў гэта становіцца для яе руціннай, штодзённым «абавязкам», да чаго ўсе прызвычайваюцца. Кліч аб дапамозе, незадаволенасць тым, што партнёр па шлюбе ігнаруе магчымасць дапамагчы, успрымаюцца навакольнымі як прыдзіркі, дрэнны настрой, які «хутка пройдзе». Чамусьці свае абавязкі нашы мамы перадаюць іншым толькі тады, калі самі адсутнічаюць дома. У выніку двайная нагрузка захоўваецца, што называецца, на ўсё жыццё, паколькі нават пасля выхаду жанчыны на працу пасля дэкрэтнага водпуску пераразмеркавання хатніх спраў практычна ніколі не адбываецца.



*Напярэдадні водпуску па доглядзе дзіцяці загадзя падрыхтуйце сябе і іншых, не паведамляйце навіну ў апошні момант, забяспечце пэўную перадачу спраў.*

### 2. Не разлічвайце толькі на сябе

Нямецкія вучоныя падлічылі, што на пачатку сумеснага пражывання 40% пар маюць роўнае размеркаванне хатніх абавязкаў. Пасля 14 гадоў шлюбу доля такіх саюзаў зніжаецца да 14%. На гэта ёсць дзве прычыны. Негатоўнасць жанчын да перадачы партнёрам адказнасці за «ўтульнасць у доме» і адсутнасць хоць якіх-небудзь перамоў на гэтую тэму. Жанчыны рады дапамозе сваіх партнёраў, аднак пакідаюць ім толькі ролю памочнікаў, якія не маюць ні якой-небудзь улады, ні адказнасці. У Брытаніі падлічылі, што ў імкненні да дасканаласці жанчыны праводзяць каля 3 гадзін на тыдні — гэта калі яны перарабляюць па доме тое, што іх мужчыны зрабілі «не так».

«Жанчыны з цягам часу дасягаюць поспеху ў забеспячэнні сям'і, вырашаюць хатнія пытанні, набываюць кватэры, ладзяць рамонты. Аднак пры гэтым скардзяцца на тое, што «мужчына ні да чаго не здатны», «не адчувае адказнасці за сям'ю», «не дапамагае дома», «зарабляе менш» і г.д.», — кажа Вольга Янчук.

*Не разлічвайце заўсёды толькі на сябе, выкарыстоўвайце розныя магчымасці, у тым ліку гібкі графік працы.*

### 3. Вядзіце перамовы

Як высвятляецца, абсалютная большасць пар не вядзе перамоў адносна раздзялення хатніх абавязкаў.

«З мужам варта прамаўляць усе свае працоўныя і сямейныя планы на дзень, — удакладняе Вольга. — Размеркаванне адказнасці дазваляе цаніць намаганні адно аднаго».

*Будуйце свае адносіны са сваякамі так, каб час ад часу разлічваць на іх. У працы спрабуйце вырашыць рабочыя пытанні самі, з дапамогай блізкіх, і толькі ў крайніх выпадках шукайце замену сярод калег. Рэальна ацэньвайце ўласныя магчымасці.*

### 4. Не адсякайце цікавыя ролі

Кожны чалавек праходзіць праз моманты прыняцця важных жыццёвых рашэнняў: выбар прафесіі, шлюб, нараджэнне дзяцей і г.д. Па статыстыцы, большасць жанчын з зайздросным пастаянствам прымае рашэнні на карысць сям'і і на шкоду кар'еры. Праблема ў тым, што кожны з агучаных момантаў вызначае будучыню чалавека, і з кожным рашэннем магчымасці вярнуцца і «ўсё перайграць» скарачаюцца. Па меркаванні адной нямецкай газеты, гэта стала для многіх жанчын прамым шляхам да беднасці.

«Я не раю жанчынам выбіраць па жыцці толькі адну ролю, — кажа Вольга Янчук. — Чалавек павінен знаёміцца з рознымі варыянтамі ролевага выканання сямейнага жыцця і выбіраць той ролевы набор, які падыходзіць для канкрэтнай пары ў канкрэтнай сітуацыі. Разнастайнасць роляў робіць чалавека шчаслівым, а выбар толькі адной звужае ўласныя магчымасці атрымаць задавальненне ад жыцця. Напрыклад, роля мамы часта перакрывае ролю жонкі ў сем'ях з малымі дзецьмі. Аднак такая сітуацыя з'яўляецца нармальнай толькі на працягу першых месяцаў жыцця малога, калі гэта фізіялагічна абумоўлена: адбываецца працэс адладжвання сістэмы, прысутнічае пастаянная неабходнасць абслугоўваць патрэбы дзіцяці. І тут вельмі важна, каб тата і мама не аддаліліся адно ад аднаго, а таксама каб тата не аказаўся без сямейных абавязкаў».

*Партнёр па шлюбе павінен атрымаць задавальненне ад новай ролі бацькі. Падтрымайце яго ў набыцці навыкаў па доглядзе дзіцяці. Не затрымлівайцеся працяглы час на частковай занятасці, каб гэта не перашкодзіла вашай кар'еры. Не давайце іншым нагоду думаць, што вы ў меншай ступені «хварэеце» за сваю работу. З другога боку, работа ніколі не павінна замяняць асабістае жыццё.*

### 5. Цаніце сябе і свой вопыт

Некаторыя жанчыны перажываюць пачуццё віны, непаўнацэннасці, калі ідуць у дэкрэтны водпуск. Не варта гэтага рабіць. Жанчына ў ролі маці набывае вельмі добрыя якасці — здольнасць засяроджваць увагу на некалькіх рэчах, тайм-менеджмент, уменне выслухаць, імкненне да пастаяннай самаадукацыі.

*Сачыце за тым, калі і як у вашай арганізацыі адбываюцца кадравыя прызначэнні, што неабходна для таго, каб быць у ліку сапраўдных «з патэнцыялам». Пакуль вы ў водпуску па доглядзе дзіцяці, не пазбягайце карпаратыўных мерапрыемстваў і сустрэч.*

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Так бывае



**Яе завуць Надзея, цяпер ужо Фёдараўна. Яна нарадзілася і вырасла ў адным з абласных цэнтраў. Свой «лёс» сустрэла там жа. Яго звалі Аляксей — з ім дзяўчына вучылася ў школе, а пасля 11-га класа пара вырашыла пажаніцца. Мужам учарашні аднакласнік стаў цудоўным: пяшчотным і працавітым. Маладая сям'я вельмі хутка абзавялася неабходнымі атрыбутамі сямейнага шчасця: асабістай аднапакаёвай кватэрай, аўтамабілем. А потым нарадзілася Настачка — іх дачушка.**

# ДВОЙЧЫ РАЗВЕДЗЕНАЯ

Аляксей, каб абедзве яго любімыя жанчыны ні ў чым не мелі патрэбы, вырашыў заняцца ўласным бізнесам і адкрыў маленькую кавярню. Справы пайшлі добра і праз год у Аляксея з'віліся яшчэ дзве кавярні. А неўзабаве сям'я развіталася з аднапакаёўкай і пераехала ў добры двухпавярховы катэдж. Надзея не магла нарадавацца на мужа.

Незаўважна падрасла і пайшла ў першы клас Настачка. Гады ляцелі хутка, у сям'і панавалі любоў, дабрабыт і спакой. Надзеі зайздросцілі ўсе сяброўкі і знаемыя: «Бач ты, ніколі прыгажуняй не была, а такога мужыка сабе знайшла!».

— І, мабыць, сурочылі, — расказвае мая суразмоўца, — Настачка якраз перайшла ў сёмы клас, як у майго Аляксея згарэла кавярня. У нас з мужам было падазрэнне, што яе спалілі, але нічога даказаць мы не здолелі. Потым па выніках праверкі закрылі другую кавярню. А праз некалькі месяцаў мы былі вымушаны развітацца і з апошняй: цяжка захварэла дачка, спатрэбіліся дарагія лекі, і Аляксей прадаў бізнес.

Праблемы, з якімі сутыкнулася сям'я, негатыўна паўплывалі на Аляксея: ён пачаў злоўжываць алкаголем. Надзея трымалася: ратавала дачку і спрабавала ўшчуваць мужа. Настачка, на шчасце, пайдаравела, а вось Аляксея цяжка было пазнаць: ён стаў грубым, жорсткім, рэзкім. Не было дня, каб не прыклаўся да бутэлькі, але пакінуць мужа ў такой сітуацыі Надзеі не дазваляла сумленне. Колькі б яшчэ яны так жылі, невядома, але аднойчы Аляксей падняў на Надзею руку. У выніку жанчына тыдзень правяла ў бальніцы.

Пасля гэтага Надзея сабрала рэчы і разам з дачкой пераехала да старэнькіх бацькоў у вёску. Там уладкавалася прадаўцом у мясцовую краму... Пакупнікоў было шмат. Але яна амаль адразу звярнула ўвагу на высокага сімпатычнага мужчыну. Міхаіл працаваў трактарыстам, меў добрую рэпутацыю ў калгасе. Сустракаліся з Надзеяй яны нядоўга.

— Міхаіл сказаў, што мы — людзі дарослыя. Навошта каля агароджы стаяць? Вось і вырашылі пажаніцца, — расказвае жанчына.

Калгас выдзеліў сям'і дом з выгодамі і прысядзібным участкам, на якім Міхаіл вельмі хутка пасадзіў уласны сад. Надзея зацяжарала. На свет з'явіўся сын Ігар. Пачаўся новы перыяд жыцця...

...Скончыла школу і паступіла ў інстытут Насця, падрос і пайшоў у першы клас Ігар. Міхаіл па-ранейшаму працаваў у калгасе, займаўся гаспадаркай. А яна была немалая: дзве каровы, чацвёра свіней, куры, гусі...

Каля хаты — агарод з парніком для агуркоў і памідораў. У садзе — яблыні, грушы, вішні, слівы, чарэшня. Далей — кусты агрэсту і маліны. Сям'я заўсёды была забяспечана садавінай і агароднінай.

Усё ў іх было добра, пакуль аднойчы Надзея не даведалася, што ў яе мужа з'явілася маладая «сяброўка» ў суседняй вёсцы. Спачатку жанчына цярпела і рабіла выгляд, што нічога не заўважае. Гэта цягнулася да таго часу, пакуль ў «сяброўкі» не нарадзілася дачка. Такога Надзея Фёдараўна ўжо вытрываць не змагла. Яна зноў усё кінула і перабралася назад у горад. Там у чарговы раз уладкавалася на працу ў краму, атрымала месца ў інтэрнаце.

— Я была вымушана зноў усё пачынаць з нуля. Так узлавалася на Міхаіла, што забараніла сыну падтрымліваць з ім адносіны. Навошта хлопчыку бацька, які нам здрадзіў? — разважала Надзея Фёдараўна.

Спачатку Міхаіл спрабаваў сустракацца з сынам, наладзіць адносіны з былой жонкай, але потым кінуў гэтыя спробы. У новым шлюбе ў яго нарадзіўся яшчэ адзін сын. Патрэба ў стасунках з Ігарам у Міхаіла пакрысе знікла.

...Прайшлі гады. Жонка Міхаіла памерла ад раку. Ён застаўся з двума дзецьмі на руках і «ўспомніў» пра Надзею. Але яна яму не даравала: нават размаўляць не стала. І сыну Ігару, як і раней, забараніла мець стасункі з бацькам.

Сама ж Надзея нядоўга жыла ў інтэрнаце — неўзабаве адкрыла ўласную краму, пабудавала кватэру.

А зусім нядаўна ў яе жыцці з'явіўся... першы муж Аляксей. Ён кінуў піць, зноў адкрыў кавярню і ўсё запрашае Надзею на спатканне. Але тая з прахалодай ставіцца да яго заляцанняў. «Дзякуючы» двум шлюбам яна навучылася быць моцнай. Мабыць, занадта моцнай і занадта незалежнай, каб зноў закахацца.

**Настасся КАЗІМІРАВА**

■ З пункту гледжання псіхолага

# ЖАНЧЫНА З «ДЭФЕКТАМ»

## Як выбраць новага спадарожніка жыцця і не наступіць на граблі былых адносін?



**Скасаванне шлюбу — адзін з самых моцных стрэсаў, які перажывае чалавек у сваім жыцці. Ён нават параўнальны са смерцю родных. Жанчына, якая знаходзіцца ў стане скасавання шлюбу ці перажывае наступствы гэтага кроку, мае асаблівую патрэбу ў дапамозе і падтрымцы. І вось што раіць прадстаўніцам прыгожай паловы чалавецтва ў гэтай сітуацыі псіхолаг Лілія Ахрэмчык.**

**— У грамадстве ўсталявалася меркаванне, што разведзеная жанчына — гэта дрэнна, яна нібы з дэфектам. Маўляў, мужчыны ад добрых жонак не збягаюць. А вы як лічыце: скасаванне шлюбу для жанчыны — гэта пачатак ці канец асабістага жыцця? І як выбраць новага спадарожніка, каб не наступіць на граблі былых адносін?**

— Безумоўна, гэта канец... ранейшага жыцця. Калі жанчына — разумная. А калі не, тады пацягне з сабой у новыя адносіны ўсе непрыемнасці з былога шлюбу: у гэтым выпадку, думаю, зразумела, што з ёю зноў здарыцца. Тады навошта было нешта мяняць у сваім жыцці і развітвацца з былым мужам? Каб не паўтарыць зробленых раней памылак, неабходна высветліць, што не задавальняла жанчыну ў папярэдніх адносінах, з чым яна ніколі не здолее змірыцца. А потым скласці партрэт мужчыны, з якім хацелася б звязаць сваё жыццё: ад росту і колеру валасоў да... жыццёвага сцэнарыя. І калі лёс падаруе патрэбную сустрэчу, жанчына ўжо не зробіць былых памылак.

**— Як хутчэй «ачомацца», вярнуцца да жыцця пасля скасавання шлюбу?**

— Расслабіцца па поўнай... Жарт. Але на самой справе, ён не далёкі ад ісціны — скасаванне шлюбу трэба адплакаць. Як менавіта жанчына гэта будзе рабіць, яе справа: можна са шклянкай віна і з сяброўкамі на кухні (толькі не перагнуць з алкаголем), можна — з маладым прыгажуном у ложку, а можна — ціха ўсхліпваючы ў падушку. Такім чынам, дазваляецца сябе пашкадаваць. Можна таксама выдаліць усе фота з былым мужам у сацыяльных сетках ці на іншых носьбітах. Альбо патэлефанаваць яго новай спадарожніцы і нагаварыць ёй розных «прыемнасцяў». Дазваляецца і гэта (вы ўжо нічога не страчваеце). Можна рабіць усё, пакуль гора не будзе выпіта да дна. Як толькі жанчына наблізіцца да апошняй мяжы ў сваіх пакутах (а яна гэта абавязкова адчуе) — тады і трэба пачынаць новае жыццё. Схадзіць у лазню, зрабіць масаж, купіць сукенку, перафарбаваць валасы. Сэнс дзеянняў у тым, каб прынесці задавальненне целу, праз якое, глядзіш, адпачне і душа. Потым неабходна ўзгадаць пра ўсё тое, што забараняла сабе жанчына падчас шлюбу ці на што ў яе не хапала грошай: паехаць адпачыць і паглядзець новыя месцы, дзе даўно марыла пабываць, заняцца нейкім відам мастацтва, прадаць гаспадарку ці наадварот — купіць у дадатак да таго, што ёсць, нешта новае. На шчасце, мужчыны — хаця і вельмі значная частка нашага жыцця, але не адзіная.

**— Як адважыцца завесці новыя адносіны? Праз які час гэта лепш зрабіць — адразу кідацца ў акіян новых пачуццяў ці пачакаць?**

— Калі жанчына кінецца ў новыя пачуцці, як у акіян, — яна ў іх патоне. А хочацца ж выплысці, праўда?.. Вось і трэба спачатку навучыцца плаваць самастойна. І потым... Жанчына марыць сустрэць не бервяно, каб за яго ўхапіцца, а сімпатычнага плыўца. Так?

**— Тады на што неабходна звярнуць увагу ў новых адносінах, каб пазбегнуць былых памылак? На якія граблі часцей за ўсё наступаюць пары?**

— Добра, калі ўвагу наогул атрымаецца на чымсьці засяродзіць... Тут якраз і ідзе размова пра асэнсаванне, пра тое, каб навучыцца назіраць за сваім жыццём. Трэба ўмець спыніцца, абдумаць, ацаніць, зразумець, па якіх прычынах здарылася нешта кепскае, што гэтаму паспрыяла. Каб новыя адносіны склаліся не так, як былыя, трэба, каб добра папрацавала душа. А памылкі... Сярод галоўных назаву дзве: нежаданне ці няўменне ставіць сябе на месца іншага чалавека, імкненне атрымліваць, а не аддаваць.

**— Ці трэба захоўваць адлегласць альбо ўсё ж падтрымліваць сяброўскія адносіны з былым мужам, нават калі ён прамяняў цябе на іншую?**

— Усё індывідуальна. Калі былых мужа і жонку задавальняе новая форма адносін і ніхто ў іх не адчувае сябе ахвярай, тады сяброўства магчыма. Калі, напрыклад, нехта з дваіх працягвае кахаць іншага, то такая форма адносін ёсць залежнасць, якая пазбаўляе чалавека свабоды, у тым ліку ў стварэнні новай пары.

**— Калі ад былога мужа нарадзіліся дзеці, ці трэба ім дазваляць падтрымліваць адносіны з бацькам?**

— А хто даў права былой жонцы ператварацца ў суддзю? Агучанае пытанне гаворыць пра тое, што жанчына лічыць сябе лепшай і больш маральна устойлівай за мужчыну. І чамусьці ўпэўнена, што яна надзелена правам вырашаць лёсы — бацькі і дзіцяці. Ці не замнога гэта для звычайнай прадстаўніцы прыгожай паловы? Богу — Богава, Кесару — Кесарава. У маці з дзіцем свае адносіны, у таты — свае. Што датычыцца ўзаемаадносін паміж былымі мужам і жонкай, то рабіць выгляд, што яны добрыя сябры, калі гэтага няма на самой справе, таксама не трэба. Дзеці адчуваюць падман, і ім нельга дэманстраваць такую форму адносін — яны іх могуць перанесці потым, калі стануць дарослымі, у сваё жыццё. Былому мужу і жонцы трэба быць праўдзівымі адно з адным: атрымліваецца сябраваць — сябруйце (калі новыя партнёры не супраць), не атрымліваецца — звязвайцеся толькі па пытаннях, якія датычацца дзяцей.

**— Што рабіць, калі асабістае жыццё ў жанчыны пасля скасавання шлюбу складваецца паспяхова, але былы муж (а такія сітуацыі таксама здараюцца нярэдка) працягвае ўмешвацца ў яе жыццё, спрабуючы яго кантраляваць?**

— Кантралююць таго, хто дазваляе гэта з сабой рабіць. Калі жанчына не звяртаецца па дапамогу ў міліцыю, ёй трэба задумацца, чаму яна адчувае патрэбу ў кантролі з боку былога мужа. Магчыма, у яе яшчэ захаваліся пачуцці, ці такім чынам яна правакуе новага абранніка, альбо ёй як асобе патрэбна такая кантралюючая сіла... Прычын, па якіх жанчына імкнецца заставацца залежнай ад былога мужа, шмат, і ўсвядоміць іх можа толькі яна сама. А калі не атрымліваецца, неабходна звярнуцца па дапамогу да спецыяліста-псіхолага.

**Гутарыла Гелена АВЕЛА**

# БРУНЕТКІ СУПРАЦЬ БЛАНДЗІНАК. АБО НААДВАРОТ

## Ці залежыць жаночае шчасце ад колеру валасоў?

**Спрэчка за прыгажосць і ўвагу мужчын паміж бландзінкамі і брунеткамі вядзецца даўно. Бландзінкі часта папракаюць брунетак у захопніцкіх памкненнях і няшчырасці, брунеткі бландзінак — у глупстве і штучнасці паводзін. А прадстаўнікі моцнай паловы, як звычайна, не могуць спыніць свой выбар на кімсьці канкрэтна. Але не трэба спяшацца папракаць мужчын у нерашучасці: усе жанчыны — такія прыгожыя і непаўторныя. Сёння бландзінкі і брунеткі зноў сышліся ў спрэчцы. На чыім баку будзе перамога?**



— Спецыяльна я ніколі не аддавала перавагу цёмнаму колеру валасоў, — кажа **Дзіяна БАЛЫКА, драматург, паэт і празаік.** — Замест мяне гэта вырашыла прырода. А я лічу яе разумнай і не спрачаюся з ёю ў такіх дробязях.

У бландзінку я ніколі не фарбавалася. Некалькі разоў рабіла мeліраванне і насіла мeліраваны парык. Пры тым што я вельмі люблю змяняцца, адчувала, што блонд мне не пасуе. У маім уяўленні сапраўдная бландзінка павінна мець валасы даўжынёй да ягадзіц. А я ў гэтым плане адораная сціпла. Гэта як у анекдоце: адны стаялі ў чарзе па валасы, другія пабеглі па інтэлект, трэція — па вялікія грудзі... Відаць, у чаргу па валасы я прыбегла апошняй. І выбірала з таго, што засталося.

Цёмны колер люблю за тое, што ён мой, прыродны. Але ж не магу сцвярджаць, што не люблю бландзінак ці лічу іх дурніцамі. Няма нічога немагчымага для чалавека з інтэлектам! Ён нават можа быць бландзінкай! Спачатку інтэлект, а ўжо потым — колер валасоў. Мая лепшая сяброўка — натуральная бландзінка — актрыса і рэжысёр па адукацыі, журналіст па прызванні, тэлепрадзюсар па прафесіі. Яна і ў «гарачых кропках» пабывала, і дакументальнае кіно здымала, і пяты раз замужам. І маці дваіх дзяцей. Не жанчына, а спрэс добрыя якасці. І колер валасоў тут зусім не пры чым.

Так, ёсць такая з'ява, як нелюбоў брунетак да бландзінак і наадварот. Чаму? А чаму лысыя не любяць валасатых, бедныя — багатых, дурныя — разумных, бяздарнасці — таленавітых? Бландзінкі і брунеткі — не выключэнне. Я ўпэўнена, што моц — не ў валасах, а ў харызме і інтэлекце. На практыцы ў барацьбе за мужчынскую ўвагу перамагаюць жанчыны, якія ўмеюць захапляцца мужчынам, а не трасуць перад ім валасамі.

А вось што думае другая прадстаўніца брунетак — **Вікторыя БАГРЫНА, летуценніца і вандроўніца**:



— Цёмны колер валасоў у мяне натуральны. Фарбавацца ў бландзінку не даводзілася, але эксперыменты з валасамі я праводзіла. Неяк мне падарылі наведванне дарагога салона ў Еўропе, дзе праз чатыры гадзіны пакут я ўбачыла сябе — толькі... з вогненна-рыжымі валасамі... Вынік, мякка кажучы, не адпавядаў цане!.. А пасля таго, як мяне яшчэ раскрытыкавала і мая бабуля, я вярнула сабе былы шакаладны колер.

Калі шчыра, з маім тыпам знешнасці не ўяўляю сябе бландзінкай. Цёмныя валасы, карыя вочы... Вандруючы па свеце, я магу быць іспанкай ці ўвогуле жанчынай усходняга тыпу, але ні ў якім разе не славянкай! Што якраз да лепшага, бо славянскія дзяўчаты «адзначыліся» ва ўсім свеце не надта «ўзорнымі» паводзінамі...

Хто больш разумнейшы — бландзінкі ці брунеткі?.. Хацелася б думаць, што брунеткі, але гэта не будзе адпавядаць рэчаіснасці. У жыцці шмат прыкладаў, калі бландзінкі скараюць неверагодныя вяршыні сваім розумам і нават уплываюць на гістарычныя падзеі. Наконт узаемнай нелюбові бландзінак і брунетак... На мой погляд, жанчыны наогул не вельмі любяць адна адну — яны ва ўсім бачаць саперніцтва, тым больш, калі жывуць у краіне, дзе прадстаўніц слабой паловы ў паўтара раза больш, чым мужчын...

Дарэчы, у брунетак ёсць бясспрэчныя перавагі: яны прыгожыя і без макіяжу. А вось бландзінкі — далёка не кожная... Але затое бландзінка здаецца больш крохкай і бездапаможнай, і мужчыны тут як тут — заўсёды гатовы яе пашкадаваць! Брунеткі ж занадта яркія, часта дамінуюць у адносінах і здольныя зацямніць сабой любога прыгожага мужчыну. А каму гэта спадабаецца!? Таму думаю, што ў барацьбе за мужчынскую ўвагу ўсё ж перамагаюць... бландзінкі.

Дзіяне і Вікторыі пярэчыць **Таццяна КАМЕНСКАЯ — індывідуальны прадпрымальнік з выразнай знешнасцю.** І, дарэчы, маці дваіх дзяцей:

— Мой колер валасоў — гэта стан душы. У мяне мяккі і стрыманы характар. Менавіта бландзінкай я знаходжуся ў згодзе з асабістым унутраным светам, таму ніколі не фарбавалася ў брунетку. Да таго ж у бландзінак ёсць свае моцныя бакі. Дзякуючы беламу колеру валасоў заўсёды можна скарыстацца «зніжкай на дурніцу» ці «прыкінуцца бландзінкай», што вельмі зручна ў розных жыццёвых сітуацыях. Думаю, брунеткам з такімі «зніжкамі» шанцуе значна менш.



Хто насамрэч разумнейшы — бландзінкі ці брунеткі?.. Лічу, што тыя дзяўчаты, якія, незалежна ад колеру валасоў, больш займаюцца сваёй адукацыяй. А вось з тым, што бландзінкі не любяць брунетак і наадварот, не згодная. Я аднолькава добра стаўлюся як да бландзінак, так і да брунетак. Што датычыцца саперніцтва за ўвагу мужчын, то бландзінкі і брунеткі адрозніваюцца не толькі колерам валасоў, але і характарам. Да таго ж у кожнага мужчыны — свой ідэал жаночай прыгажосці, таму ў барацьбе за ўвагу моцнай паловы няма аўтсайдараў — як сярод брунетак, так і сярод бландзінак.

А каму, цікава, аддаюць перавагу мужчыны — бландзінкам ці брунеткам?..



— Прыгожая жанчына для мяне — гэта агульны вобраз, а не толькі колер валасоў — цёмны ці светлы, кажа **Вадзім БАРАВІК, генеральны дырэктар Мінскага гарадскога цэнтра перакладаў,** — у знешнасці прадстаўніцы слабой паловы павінна быць гармонія. Вялікую ролю, безумоўна, адыгрываюць спачатку манера дзяўчыны апранацца і яе знешнасць. І калі ўсё гэта спадабалася, мужчына, які знаходзіцца ў пошуку жанчыны для сур'ёзных адносін, звяртае ўвагу на яе характар, унутраны свет і іншыя якасці, якія лічыць для сябе значнымі. У мяне здараліся рамантычныя адносіны з рознымі дзяўчатамі, але часцей — з брунеткамі. Хаця колер валасоў у гэтым не адыгрываў галоўную ролю: прыгожая жанчына непаўторная з любым адценнем валасоў, галоўнае — умець дэманстраваць сваю прывабнасць іншым людзям. Вядома, мне больш падабаюцца прыгажуні. Але для працяглых адносін, акрамя знешнасці, неабходны асабістыя якасці чалавека. Да таго ж пры працяглым знаёмстве ў мужчыны з'яўляецца магчымасць убачыць сваю спадарожніцу і бландзінкай, і брунеткай. Але сам я ніколі не прымушаў абранніцу змяняць колер валасоў.



**Віталю КАРПАНАВУ (гурт «Дразды»)** здаецца, што жаночая прыгажосць — не ў колеры валасоў.

— У мяне, калі я не памыляюся, не было цесных адносін з бландзінкамі, — кажа Віталь. — Часцей сустракаўся з рыжымі і з... кучаравымі. З імі мне весялей. А наогул — галоўнае, каб быў добры чалавек.



**Ігар ДАНІЛАЎ, бізнесмен,** таксама ўпэўнены, што колер валасоў жанчыны не мае значэння. Розум, інтэлект, шарм, здольнасць падтрымаць мужчыну — вось што галоўнае.

— Часам жанчына спачатку зробіць з мужчыны анучу, а потым здзіўляецца, чаму ён такі. А як яму змяніцца, калі яна ўжо яго псіхалагічна зламала?..

Вось так разважае Ігар, і з ім пагаджаюцца многія прадстаўнікі моцнай паловы. Так што жаданне ўразіць мужчыну з дапамогай нейкага новага колеру валасоў — гэта выключна наша, жаночая, фантазія. Мужчыны звяртаюць увагу зусім на іншае...

**Алена КАВАЛЁВА**

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 16 мая 2013 года проводит 3-ий повторный открытый аукцион от 06 марта 2013 года. 4-ый повторный открытый аукцион от 14 марта 2013 года, 6-ой повторный открытый аукцион от 11 апреля 2013, 7-ой и 8-ой повторные открытые аукционы от 24 апреля 2013 года и 9-ый повторный аукцион от 30 апреля 2013 года по продаже имущества республиканской собственности на 10-ом открытом аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел.руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 44 | Грузовой Урал-4320-0010-01 ш. 172395 дв. 771192 1991 г. 3 кат. 126000 км | г. Слоним, в/ч 33933 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 58 | Грузовой Урал-4320 ш. 053663 дв. 881318 1986 г. 3 кат. 103478 км | г. Слоним, в/ч 33933 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 59 | Грузовой Урал-43202 ш. 104575 дв. 309199 1988 г. 3 кат. 103238 км | г.Слоним, в/ч33933 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 60 | Грузовой Урал-43202 ш. 028575 дв. 639407 1984 г. 3 кат. 98180 км | г.Слоним, в/ч33933 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 61 | Грузовой Урал-4320-0011 ш. 079243 дв. 110489 1987 г. 3 кат. 116589 км | г.Слоним в/ч33933 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 69 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 022398 дв. 578407 1984 г. 4 кат. 40180 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 117 | Мастерская ПМ-2-70М №Т35114 1986 г. в составе: -МРМ-М1 № 032 на ЗИЛ-131 ш. 663747 дв. 507616 1985 г. 3 кат. 3770 км -МРС-АР № 060 на ЗИЛ-131 ш. 655891 дв. 469882 1985 г. 3 кат. 1170 км -ТА-5М № Т35114 на ш. КамАЗ-4310 ш. 013348 дв. 806130 1986 г. 3 кат. 3661 км -ЭСБ-4-ВЗIIМ1 № АБ23608247 -АДБ-3122У1 № Т35114 на пр.1-П-2,5 ш. 0712 1985 г. 2 кат. 955 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 140 000 000 | 14 000 000 |
| 118 | Грузовой КрАЗ-260 ш. 526975 дв. 921994 1987 г. 4 кат. 53060 км | г. Брест, в/ч 92504 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 119 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 248749 дв.0216 1975 г. 4 кат. 6427 км | г. Бобруйск, в/ч 96869 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 121 | Седельный тягач КрАЗ-255В ш.160170 дв. 8930007 1982 г. 4 кат. 57152 км | г. Фаниполь, в/ч 30151 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 122 | Автошасси Урал-4320-1012 ш. 070434 дв. 033218 1987 г. 4 кат. 90461 км | г. Береза, в/ч 23324 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 123 | Автошасси Урал-4320-1012 ш. 009553 дв. 2771 1982 г. 4 кат. 126445 км КР-1992. | г. Береза, в/ч 23324 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 124 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 109345 дв. 344664 р. 10109345 1988 г. 3 кат. 149410 км | г. Новогрудок, в/ч 14103 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 127 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 143332 дв. 568305 1990 г. 3 кат. 108638 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 132 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 118867 дв. 406764 1989 г. 3 кат. 81624 км | г.Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 0000 | 4 500 000 |
| 133 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 163502 дв. 712212 1990 г. 3 кат. 81862 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 135 | ТЗА-7,5–5334 (топливозаправщик авиацион.) с/о А8710114 на МАЗ-5334 ш. 90346 дв. 773195 1987 г. 4 кат. 66998 км 2538,9 м/ч | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 136 | ТЗА-7,5–5334 (топливозаправщик авиацион.) с/о А8310140 на МАЗ-5334 ш. 47030 дв. 628139 1983 г. 4 кат. 14287 км 396,7 м/ч | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 137 | АТМЗ- 5-4320 (автотопливомаслозаправщик) с/о 3446 на УрАЛ-4320 ш. 076062 дв. б/н 1987 г. 4 кат. 50978 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 138 | АТМЗ- 5-4320 (автотопливомаслозаправщик) с/о 1921 на УрАЛ-4320 ш. 038380 дв. 747910 1985 г. 4 кат. 32267 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 139 | Грузовой Урал-4320-0010-01 ш. МО171985 дв. 769094 1991 г. 3 кат. 116068 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 140 | Грузовой Урал-4320-0011-02 ш. МО182033 дв. 835252 1991 г. 3 кат. 81631 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 141 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. LO151656 дв. 632994 1990 г. 3 кат. 89851 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 142 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. LO154286 дв. 222551 1990 г. 3 кат. 83084 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 143 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. LO150979 дв. 627645 1990 г. 3 кат. 93914 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 145 | Грузовой Урал-4320-0710-01 ш. 104722 дв. 308041 1988 г. 4 кат. 163771 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 146 | Мастерская МРМ-М1 №132 на ш. ЗИЛ-131Н ш. 737522 дв. 849768 1987 г. 4 кат. 4407 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 147 | Лесовозный тягач МАЗ-509А ш. 38536 дв. 9100915 1991 г. 4 кат. 291 км, прицеп-роспуск ГКБ-9383-012(2-Р-15) ш. 749 1984 г. 4 кат. 4280 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 110 000 000 | 11 000 000 |
| 148 | Седельный тягач КамАЗ-54112 ш.204561 дв.687567 1989 г. 4 кат. 189548 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 149 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 599300 дв. 0338 1987 г. 3 кат. 68631 км | г. Брест, в/ч 92504 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 150 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 002743 дв. 692652 1985 г. 3 кат. 127165 км | г.Фаниполь, в/ч 30151 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 151 | Автошасси Урал-4320-1012 ш. 024644 дв. 598027 1984 г. 4 кат. 1589 км | г. Береза, в/ч 23324 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 153 | Автошасси Урал-4320-1012-01 ш. 170797 дв. 560552 1991 г. 4 кат. 161684 км | г. Барановичи, в/ч 29969 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 154 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 590417 дв. 053582 1987 г. 4 кат. 70720 км | г. Гродно, в/ч 97097 | 25 000 000 | 2 500 000 |
| 155 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 310923 дв. 081 1977 г. 4 кат. 67650 км | г. Гродно, в/ч 97097 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 156 | Грузовой КрАЗ-260 ш. 684808 дв. 28305 1985 г. 4 кат. 90948 км | г. Гродно, в/ч 97097 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 158 | Самосвал КамАЗ-5511 ш. 0291409 дв. 040903 1987 г. 3 кат. 164125 км | г. Фаниполь, в/ч 30151 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 159 | Седельный тягач КамАЗ-54112 ш. 0027735 дв. 0744105 1991 г. 3 кат. 174088 км, полуприцеп ОДАЗ-9385 ш. 9385 1991 г. 4 кат. 174088 км | г. Фаниполь, в/ч 30151 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 161 | Автошасси Урал-4320 ш. 8997 дв. 802368 1983 г. 4 кат. 121854 км | г. Береза, в/ч 23324 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 166 | Мастерская МРМ № б/н на ш. ЗИЛ-131Н ш. 878789 дв. 518957 1990 г. 4 кат. 1710 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 167 | Автошасси МАЗ-5334 ш. 116700 дв. 650757 1989 г. 3 кат. 78532 км, кузов-фургон КМ-500 № б/н 1988 г. 4 кат. | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 70 000 000 | 7 000 000 |
| 168 | Седельный тягач КрАЗ-255В ш. 251749 дв. 0178 1975 г. 5 кат. 18150 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 169 | АЦ-5,5-375 (автоцистерна) с/о 8307045 на ш. Урал-375 ш. 404375 дв. 944304 1983 г. 4 кат. 8704 км 46,9 м/ч | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 170 | АЦ-5,4-375 (автоцистерна) с/о 14727 на ш. Урал-375 ш. 411804 дв. 011573 1983 г. 4 кат. 7657 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 171 | АЦ-5,4-375 (автоцистерна) с/о11120 на ш. Урал-375 ш. 353899 дв. 421114 1981 г. 4 кат. 5667 км 75,5 м/ч | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 172 | АЦ-5,4-375 (автоцистерна) с/о 15231 на ш. Урал-375 ш. 419850 дв. 122839 1984 г. 4 кат. 2128 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 35 000 000 | 3 500 000 |
| 173 | ТЗ-8-255БМ (топливозаправщик) с/о А873306 на КрАЗ-255 ш. 596308 дв. 064332 1987 г. 4 кат. 7856 км 666 м/ч | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 82 000 000 | 8 200 000 |
| 174 | ТЗ-8-255БМ (топливозаправщик) с/о А841078 на КрАЗ-255 ш. 491637 дв. 833546 1984 г. 4 кат. 6399 км 425 м/ч | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 80 000 000 | 8 200 000 |
| 175 | Седельный тягач КамАЗ-54112 ш. ХТС541120L0027082 дв.0707751 1990 г. 3 кат. 160975 км, полуприцеп КЗАП-9370 ш. 96543 1984 г. 4 кат. 162105 км | г. Новогрудок, в/ч 14103 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 176 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. МО168841 дв. 635972 1991 г. 3 кат. 91927 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 177 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. МО169458 дв. 729039 1991 г. 3 кат. 82628 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 178 | Грузовой Урал-4320-0011-02 ш. МО181677 дв. 830660 1991 г. 3 кат. 116703 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 179 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. LO154387 дв. 652696 1990 г. 3 кат. 86486 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 180 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. КО667163 дв. 46270 1989 г. 3 кат. 72620 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 25 000 000 | 2 500 000 |
| 183 | Автошасси МАЗ-5334 ш. 83117 дв. 748914 1986 г. 4 кат. 89534 км, кузов-фургон КМ-500 № б/н 1977 г. 4 кат. | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 184 | Автошасси МАЗ-543А ш. ТА6ДВ9461089 дв. 8910К97936 1989 г. 4 кат. 34531 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 185 | Автошасси Урал-375Е ш. 381219 дв. 693656 1982 г. 5 кат. 1068 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 186 | Грузовой Урал-43202 ш. 072803 дв. 54847 1987 г. 4 кат. 148915 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 45 000 000 | 4 500 000 |

**Извещение о проведении аукциона № 3 от 06.03.13 г. опубликовано в газете «Звязда» № 9 от 17.01.13 г.**

**Извещение о проведении аукциона № 4 от 14.03.13 г. опубликовано в газете «Звязда» № 18 от 30.01.13 г., № 19 от 31.01.13 г.**

**Извещение о проведении аукциона № 6 от 11.04.13 г. опубликовано в газете «Звязда» № 27 от 12.02.13 г.**

**Извещение о проведении аукциона № 7 от 24.04.13 г. опубликовано в газете «Звязда» № 30 от 15.02.13 г.**

**Извещение о проведении аукциона № 8 от 24.04.13 г. опубликовано в газете «Звязда» № 39 от 28.02.13 г.**

**Извещение о проведении аукциона № 9 от 30.04.13 г. опубликовано в газете «Звязда» № 47 от 18.03.13 г.**

**Условия проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 65 от 09 апреля 2013 года.**

УНП 101099370

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 16 мая 2013 года проводит 3-ий повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности от 06 марта 2013 года на 10-ом открытом аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка, (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 50 | Мастерская передвижная на железнодорожном ходу МХ-М № 38 1990 г. 4 кат. КР-1990 г. в составе: Кузнечный цех-крытый вагон № 20420071 1956 г. Инструментально-механический цех – крытый вагон №20115895 1956 г. Механический цех №1 – крытый вагон №22869937 1956 г. Механический цех №2 – крытый вагон №20862207 1956 г. Электросиловой цех – крытый вагон №20096661 1956 г. Электроремонтный цех – крытый вагон №20608824 1956 г. Слесарно-сварочный цех – крытый вагон №20574596 1956 г. Агрегатно-ремонтный цех – крытый вагон №20020681 1954 г. Авторемонтный цех – крытый вагон №20032363 1958 г. Цех ремонта дизельных двигателей – крытый вагон №20748190 1952 г. | г. Слуцк, в/ч 18662 | 1 716 000 000 | 171 600 000 |
| 51 | Мастерская передвижная на железнодорожном ходу МХ-М № 21 1986 г. 4 кат. ДР-1990 г. в составе: Кузнечный цех-крытый вагон №20681730 Инструментально-механический цех – крытый вагон №20269114 -Механический цех №1 – крытый вагон №20268876 -Механический цех №2 – крытый вагон №20268777 -Электросиловой цех – крытый вагон №20220885 -Электроремонтный цех – крытый вагон №20268884 -Слесарно-сварочный цех – крытый вагон №20339560 -Агрегатно-ремонтный цех – крытый вагон №20260147 -Авторемонтный цех – крытый вагон №20260030 -Цех ремонта дизельных двигателей – крытый вагон №20220877 Все вагоны –1971 г. | г. Слуцк, в/ч 18662 | 1 430 000 000 | 143 000 000 |
| 52 | Тепловоз ЧМЭ-3 № 915 дв. К6С31ОДР №411009-4203 генератор TD 802 №1583208 1970 г. 2 кат. пробег 21 год 6 мес. | п. Жодино, в/ч 48848 | 1 495 000 000 | 149 500 000 |
| 53 | Мост автодорожный (шифр ВАР) № 1 1981 г. 2 кат. наработка 0,5 года | п. Жодино, в/ч 48848 | 3 209 000 000 | 320 900 000 |
| 54 | Мост автодорожный (шифр ВАР) № 2 1981 г. 3 кат. наработка 0,5 года | п. Жодино, в/ч 48848 | 3 209 000 000 | 320 900 000 |

